Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

10 ВЕРАСНЯ 2016 г. СУБОТА № 175 (28285)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Жыць весела і ў 65**

СТАР. 5



**Голас «спявачкі свету» гучаў у Мінску**

СТАР. 9



**Амаль забыты герой Перамогі**

СТАР. 10–11

# Ваш голас важны для краіны

**Сёння апошні дзень датэрмінованага галасавання, заўтра — непасрэдны дзень выбараў. У гэтым годзе атрымаць бюлетэні для галасавання могуць 6 990 696 грамадзян нашай дзяржавы**

**У нас удзел у выбарах з'яўляецца свабодным. Тым не менш, па словах старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ, для кожнага грамадзяніна важна прыйсці на выбары.**

**ВАЖНА!**
11 верасня ў дзень выбараў чытачы «Звязды», наведвальнікі інтэрнэт-партала Выдавецкага дома «Звязда» змогуць у рэжыме рэальнага часу адсочваць ход галасавання па ўсёй краіне. Нашы карэспандэнты будуць весці анлайн-трансляцыю з інфармацыйнага цэнтра «Выбары-2016». Далучайцеся!

У відэазвароце, размешчаным на рэсурсе vybory2016.by, старшыня Цэнтрвыбаркама адзначыла, што для таго каб выбары ў Палату прадстаўнікоў адбыліся, у іх павінны прыняць удзел больш за 50% грамадзян, унесеных у спісы для галасавання. «Таму настолькі важная яўка выбаршчыкаў», — патлумачыла яна.

Старшыня ЦВК заклікала ўспрымаць гэта з разуменнем, бо выбары — важнае дзяржаўнае мерапрыемства. «І нават справа не ў тым, што яны каштуюць досыць дорага (каля $ 10 млн), але ў тым, што выбары парламента, паспяховае завяршэнне найважнейшай палітычнай кампаніі — гэта перш за ўсё аснова палітычнай стабільнасці нашай дзяржавы. Гэта паўнавартасны палітычны легітымны орган, які будзе супрацоўнічаць з парламентамі іншых дзяржаў, годна прадстаўляць нас і абараняць нашы інтарэсы», — падкрэсліла старшыня ЦВК. «Калі не задавальняюць кандыдаты, якія балатуюцца па вашай выбарчай акрузе, існуе графа «Супраць усіх». Хоць, думаю, што ў нас добры падбор кандыдатаў, якія прадстаўляюць усе пункты гледжання», — заўважыла Лідзія Ярмошына.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**




Гэтыя гамяльчанкі, якіх наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук сустрэў учора на Кастрычніцкай плошчы, прыехалі ў сталіцу на двухдзённую канферэнцыю. Яны запэўнілі, што ў нядзелю, вярнуўшыся ў родны горад, абавязкова пойдуць на выбары.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі:**

*«Жаданне ісці ў парламент на шкоду ўласнай справе можа быць цалкам бескарыслівым крокам. Чалавек можа гаварыць, што ён усё зарабіў, у яго ўсё ёсць, капітал працуе сам па сабе, а ён хоча служыць грамадству. Але, у прынцыпе, бізнес і палітыку, бізнес і ўладу лепш не змешваць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9477 | ▲ |
| Еўра | 2,1953 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0303 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0729 | ▼ |

■ Ведай нашых!

## ЧЭМПІЁН З ХАРАКТАРАМ КАМІКАДЗЭ

**Беларусь узяла першае «золата» на Параалімпіядзе ў Рыа**



**У Беларусі з'явіўся свой Майкл Фэлпс — Ігар Бокій пяць разоў перамагаў на Параалімпійскіх гульнях у Лондане, а цяпер заваяваў «золата» і ў Рыа. Медаль стаў першым для нашай зборнай на спартыўным форуме, які праходзіць у Бразіліі.**

Пераможным для беларуса стаў заплыў на 100 метраў батэрфляем у катэгорыі S13 (спартсмены з парушэннямі зроку). Ігар Бокій паказаў вынік у 53,85 секунды і пабіў сусветны рэкорд, які належаў яму самому. Найбліжэйшымі пераследнікамі сталі ўзбекі Кірыл Панкоў і Музафар Турсунхаджаеў.

«У нас не было ніякіх чаканняў ад заплыву, — цытуе беларускага чэмпіёна афіцыйны сайт Гульняў. — Мы проста зацята працавалі разам з трэнерам, і менавіта тут я змог выкласціся па максімуме, каб дасягнуць найлепшага магчымага выніку. Цяпер я нерваваўся значна больш, чым чатыры гады таму ў Лондане. На мне ляжаў цяжкі груз адказнасці, бо вельмі шмат людзей верылі ў мяне і спадзяваліся на поспех, я не хацеў іх расчараваць. Гэта падштурхоўвала мяне працаваць і працягваць паказваць добрыя вынікі. Мой трэнер заўсёды паўтарае адну фразу ўсім падапечным: «Каб перамагчы, ты павінен мець характар камікадзэ. Ты павінен ісці да канца і не звяртаць увагі на тое, што адбываецца вакол і ўнутры цябе».

**Са знакавай перамогай Ігара Бокія павіншаваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, пра гэта паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by* ■

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!




# ЗНАЙСЦІ АГУЛЬНУЮ МОВУ

## Следчым Беларусі і Расіі ёсць чаму павучыцца адзін у аднаго

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са старшынёй Следчага камітэта Расіі Аляксандрам Бастрыкіным.**

«Я думаю, мы ў вас шмат чаму можам павучыцца. Вы ў нас можаце падгледзець нешта, таму што мы вельмі шмат зрабілі не толькі па рэформе папярэдняга следства, але і шмат зрабілі наогул, страсянуўшы праваахоўную сістэму ад міністэрстваў і ведамстваў да Вярхоўнага Суда», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы вельмі моцна прыўзнялі следства, аснасціўшы іх. Але паралельна моцна прыпаднялі і Дзяржкамітэт судовых экспертыз — без яго нікуды, вельмі ўмацавалі яго матэрыяльную базу. Мы праводзім сёння вельмі добрыя даследаванні, перш за ўсё ў інтарэсах следства. Але я заўсёды кажу Івану Данілавічу (старшыні Следчага камітэта Беларусі Івану Наскевічу): абавязкова знайдзі з кіраўніком Следчага камітэта Расіі агульную мову, каб навучыцца тым перадавым метадам, якія існуюць у вас. Гэта будзе на карысць і нам, і вам. Я ў гэтым вельмі зацікаўлены», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На сустрэчы было адзначана, што ведамствам неабходна развіваць практычнае ўзаемадзеянне, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. «Я вельмі спадзяюся, што такое ўзаемадзеянне будзе, таму што апошнім часам (не будзем казаць аб тэрарызме, хоць і гэта вельмі важна) у нас хапае свайго жулля — што ў Расіі, што ў Беларусі. Хацелася б, каб вы разам працавалі ў гэтым напрамку. Я перакананы, што ў нас гэта атрымаецца, — заявіў Прэзідэнт. — З майго боку вы заўсёды знойдзеце падтрымку і дапамогу. Мы гатовыя ў любы момант падставіць плячо, калі гэта неабходна».

У сваю чаргу Аляксандр Бастрыкін сказаў, што Следчы камітэт Расіі заключыў пагадненне аб супрацоўніцтве са Следчым камітэтам Беларусі практычна адразу ж пасля яго стварэння, і выказаў намер падчас рабочай сустрэчы яшчэ раз пагледзець «на нашу форму ўзаемадзеяння» ■

# НОВЫ ФАРМАТ ПЕРАВОЗАК

## 12 мільёнаў пасажыраў за пяць гадоў

**Сёння спаўняецца пяць гадоў з моманту адкрыцця на Беларускай чыгунцы рэгулярнага руху цягнікоў гарадскіх ліній. За гэты перыяд было перавезена каля 12 мільёнаў пасажыраў, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

У гэты дзень у 2011 годзе Беларуская чыгунка ў рамках укаранення новага фармату пасажырскіх перавозак адкрыла рэгулярны рух электрацягнікоў гарадскіх ліній па маршруце Мінск-Пасажырскі — Ждановічы — Беларусь (Заслаўе). У далейшым цягнікі гарадскіх ліній звязалі Мінск з Рудзенскам і Смалявічамі.

За мінулы перыяд новы від перавозак трывала заняў сваю нішу на транспартным рынку сталіцы. Пра гэта сведчыць устойлівая тэндэнцыя росту папулярнасці цягнікоў гарадскіх ліній. Так, у студзені-ліпені гэтага года імі перавезена больш за 2 мільёны пасажыраў, што на 9,5 працэнта перавысіла ўзровень аналагічнага перыяду мінулага года.

Сёння гарадскія лініі даюць пасажырам магчымасць у камфортных умовах і з мінімальнымі выдаткамі часу дабірацца з Заслаўя, Рудзенска і Смалявіч у Мінск і назад, а таксама ажыццяўляць перасадкі на іншыя віды грамадскага транспарту, тым самым забяспечваючы ўстойлівую сувязь жылых мікрараёнаў, прамысловых зон, а таксама гарадоў-спадарожнікаў Мінска і іншых населеных пунктаў, прылеглых да маршрутаў курсіравання цягнікоў гарадскіх ліній.



У лістападзе 2013 года быў адкрыты рэгулярны рух цягнікоў гарадскіх ліній на ўчастку Мінск — Рудзенск. У лістападзе 2015 года — да Смалявіч.

Працягваецца праца па далейшым развіцці гарадскіх ліній. Да 2020 года плануецца выканаць рэканструкцыю пасажырскай інфраструктуры на ўчастку Мінск-Пасажырскі — Койданава і арганізаваць курсіраванне цягнікоў гарадскіх ліній з ахопам двух гарадоў-спадарожнікаў, Фаніпаля і Дзяржынска. Таксама да 2020 года плануецца набыць яшчэ чатыры саставы электрацягнікоў гарадскіх ліній серыі ЭПГ.

Сёння перавозку пасажыраў забяспечваюць шэсць сучасных і камфартабельных электрацягнікоў гарадскіх ліній серыі ЭПГ вытворчасці кампаніі Stadler Bussnang AG.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# СІТУАЦЫЯ СПАКОЙНАЯ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню КДБ Валерыя Вакульчыка і памочніка Прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы Віктара Лукашэнку.**

Кіраўнік дзяржавы цікавіўся становішчам у краіне напярэдадні выбараў. Як было адзначана на сустрэчы, сітуацыя спакойная, пагрозы для бяспекі адсутнічаюць. Таксама не маецца праблем з грамадскай бяспекай.

Акрамя таго, Аляксандру Лукашэнку далажылі аб расследаванні крымінальных спраў, якія знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта.

■ З нагоды

# «ТАНК — ЖЫВЫ І З НОРАВАМ!»

## Напярэдадні Дня танкіста ўдзельнікі «Танкавага біятлону» расказалі пра асаблівасці спаборніцтва і прызналіся, за што любяць сваю прафесію

**Яшчэ некалькі тыдняў таму падмаскоўны палігон Алабіна з'яўляўся эпіцэнтрам танкавага майстэрства. За конкурсам «Танкавы біятлон», у якім удзельнічалі вайскоўцы з 17 краін свету, назіралі і беларусы. І, безумоўна, хварэлі за сваіх танкістаў, якім зусім крыху не хапіла, каб трапіць у тройку лідараў.**

Затое яны абышлі прадстаўнікоў 13 краін, саступіўшы лідарства найбуйнейшым арміям свету — Расіі і Кітая. Трэцяе месца дасталося казахскай зборнай. Наколькі жорсткай была барацьба за фінал, чаму такі важны для вайскоўцаў удзел у «Танкавым біятлоне» і ўвогуле пра любоў да прафесіі напярэдадні Дня танкіста мы пагутарылі з членамі беларускай каманды на «Армейскіх міжнародных гульнях — 2016», аднымі з самых лепшых на сёння прадстаўнікамі гэтай вайсковай прафесіі.



Фота Аляксандра ІВАНОВА.

Адзін з беларускіх экіпажаў у «Танкавым біятлоне»: Аляксей Забалуеў, Дзяніс Майсеенка і Дзмітрый Арцёмачкін не шкадуюць, што звязалі сваё жыццё з танкамі.

У 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе, дзе служаць вайскоўцы аднаго з экіпажаў, якія ўдзельнічалі ў «Танкавым біятлоне», да ўвагі сродкаў масавай інфармацыі ўжо прызвычаіліся. «Зорнай» хваробы ў іх пакуль няма: ужо каторы раз яны ахвотна расказваюць і пра спаборніцтва, і пра сябе.

Знаёмімся. Адзін з экіпажаў на «Танкавым біятлоне» прадстаўлялі намеснік начальніка штаба па мабілізацыйнай рабоце механізаванага батальёна старшы лейтэнант Дзмітрый Арцёмачкін (камандзір танка), камандзір танкавага ўзвода 355-га гвардзейскага асобнага танкавага батальёна гвардыі старшы прапаршчык Дзяніс Майсеенка (наводчык), старшы механік-кіроўца танкавай роты 355-га гвардзейскага асобнага танкавага батальёна гвардыі яфрэйтар кантрактнай службы Аляксей Забалуеў (механік-кіроўца).

Аказваецца, што вайскоўцам ужо былі знаёмыя і траса выпрабаванняў, і правілы гульні — два гады таму яны ўдзельнічалі ў «Танкавым біятлоне». Праўда, у такім складзе экіпаж змагаўся ўпершыню. Але, перш чым трапіць на падмаскоўны палігон Алабіна, танкістам давялося прайсці праз не менш складаныя спаборніцтва — толькі ўжо сярод сваіх.

— У вайсковых часцях, злучэннях і камандаваннях краіны было адабрана 15 лепшых экіпажаў, — расказвае гвардыі старшы прапаршчык Дзяніс Майсеенка. — За магчымасць прадстаўляць нашу краіну ў «Танкавым біятлоне» разгарнулася сапраўдная барацьба. У выніку з выпрабаваннямі лепей справіліся чатыры экіпажы, якія пасля пачалі мэтанакіравана рыхтавацца да спаборніцтваў.

У склад экіпажаў увайшлі не толькі вайскоўцы 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады, а і прадстаўнікі Ваеннай акадэміі, Заходняга аператыўнага камандавання, 72-га гвардзейскага аб'яднанага навучальнага цэнтра. На працягу амаль двух месяцаў яны трэніраваліся на палігоне Даманава.

— Мы ўяўлялі, што нас чакае, але, тым не менш, расслабіцца не дазваляла тое, што павялічылася колькасць удзельнікаў «Танкавага біятлону», ды, і што таіць, якасць падрыхтоўкі кожнай краіны павысілася, — адзначае старшы лейтэнант Дзмітрый Арцёмачкін. — Калі, напрыклад, у 2014 годзе за такую краіну, як Ангола, усе хваляваліся, каб яна проста даехала да фінішу, то сёлета яна склала канкурэнцыю шэрагу іншых краін.

Танкісты перакананы, што ў такі неспакойны ў свеце час «Танкавы біятлон» і іншыя падобныя мерапрыемствы не толькі павышаюць прафесіяналізм вайскоўцаў, а і ўмацоўваюць дружбу паміж ваеннаслужачымі многіх краін.

Дарэчы, паводле ўмоў, ва ўсіх спаборніцтвах армейскіх гульняў дазвалялася ўдзельнічаць на сваёй тэхніцы. Не стаў выключэннем і конкурс танкавага майстэрства.

— Свой танк — гэта першы прыяцель, — лічаць танкісты. — Ты ведаеш, як ён можа павесці сябе ў любой сітуацыі, упэўнены ў машыне. Ты яе адчуваеш. Як прынята ў нас казаць, танк — ён таксама жывы і з характарам!

Дзмітрый Арцёмачкін марыў стаць танкістам з 12 гадоў: ужо тады любоў да тэхнікі падоўгу затрымлівала хлопца ў гаражы. Яму ніхто не прарочыў ваенную кар'еру (у сям'і музыкаў вайскоўцам быў толькі дзед), але Дзіма шчаслівы, што звязаў свой лёс з гэтай прафесіяй.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by* ■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62**

**Продавец: ОАО «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95**

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №200/D-94455 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Московский, д. 64 площадью 1213,1 кв.м, наименование: магазин, назначение: торговое помещение. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 874 880/8 748 800 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 87488/874 880 000 бел. руб.

Лот №2. Изолированное помещение с инв. №200/D-92048 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Пролетарская 1-я, д. 10 площадью 1154,9 кв.м, наименование: столовая, назначение: помещение общественного питания. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 81 264,45/812 644 500 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 8 126,45/81 264 500 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **30.09.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 12.09.2016 с 8.30 по 29.09.2016 до 17.30.** Срок заключения договора купли-продажи: 10 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 12.08.2016, 16.07.2016.

**Продавец: ОАО «Витебскхлебпром», 210024, г. Витебск, ул. Горбачевского, 5, тел. (0212) 35-86-82**

Лот №1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-108266 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Змитрака Бядули 3-я, 27, пом. 39, площадью 174,7 кв.м, наименование: торговое помещение. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 88 000/880 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 8 800/88 000 000 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **11.10.2016 г. в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 12.09.2016 с 8.30 по 10.10.2016 г. до 17.30.** Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 30.07.2016.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

## Зачапіла

Рэверс з сеціва

### Д. КАСКО. «ВАНДРОЎКА ПА МІНСКУ ДАРОГАМІ ВЕДАЎ»

*(«Звязда» за 3 верасня)*

— Добра, што гэтыя школьнікі ведаюць хоць бы назву горада, у якім жывуць. Не памятаць, з чым звязана першая згадка Мінска або якія падзеі адбываліся ў нашай рэспубліцы падчас Вялікай Айчыннай вайны, на мой погляд, сапраўдная ганьба для дзевяцікласнікаў. Няўжо ім настолькі абыякавая гісторыя свайго горада, сваёй дзяржавы ў цэлым?

За сваё жыццё я прыйшла да высновы, што ў памылках дзяцей заўсёды вінаватыя дарослыя. І гаворка тут зусім не пра настаўнікаў, большасць з якіх, пра што я ведаю не па чутках, выкладваюцца на працы «на ўсе сто». Прычына сітуацыі — абыякавыя бацькі. Чым могуць цікавіцца дзеці, калі тата і мама ўвесь свой вольны час праводзяць ці ў краме, ці на кухні, ці ля тэлевізара? Ды вазьміце, нарэшце, усю сваю сям'ю і выпраўцеся на экскурсію! Гэта і добрае баўленне часу, і са сваімі дзецьмі станеце больш блізкімі, і веды папоўніце!

**Марына Пятроўна,** *г. Мінск.*

### С. БАРЫСЕНКА. «А МОГ БЫЦЬ ІНФАРКТ...»

*(«Звязда» за 6 верасня)*

— Уразіў мяне нават не страх пацыентаў, якія баяцца той каранарографіі... Я проста схіляю галаву перад урачамі, якія выконваюць ювелірную, як мне здаецца, работу і падвяргаюцца пры гэтым рэнтгеналагічнаму апраменьванню. Фактычна яны ратуюць жыццё цаной свайго ўласнага здароўя... А самае сумнае ва ўсім гэтым, што людзям выконваюць такія няпростыя аперацыі бясплатна, а яны ў першыя ж дні знаходжання ў бальніцы выходзяць на вуліцу і кураць! Я сама маю такога сваяка — з хваробай сэрца, сасудаў, штодня тлумачу пра шкоду курэння, а ён адказвае, што гэта вышэй за яго сілы. Вельмі сумна...

**Зінаіда Антонаўна,** *г. Рагачоў.*

### С. РАСОЛЬКА. «АДПАЧЫВАЦЬ, А НЕ ПАРУШАЦЬ І ШКОДЗІЦЬ» *(«Звязда» за 6 верасня)*

— Лічу, вельмі правільна, што рыбакоў сталі штрафаваць за смецце, пакінутае на беразе вадаёма. А як інакш, калі адсутнічае элементарная культура паводзінаў і ніякія ўшчуванні не дзейнічаюць?! Думаеце, прыемна лавіць рыбу сярод недакуркаў, бляшанак і бутэлек, якія пакідаюць пасля сябе некаторыя такія «адпачывальнікі»? Я ўжо не кажу пра шкоду прыродзе: на вадзе часам можна заўважыць сапраўдныя астраўкі з бытавых адходаў, тых жа ПЭТ-бутэлек, пенапласту, пакетаў.

Што тычыцца паляўнічых, дык кожны год у краіне, на жаль, не абыходзіцца без трагічных выпадкаў. Як паведамлялася, толькі ў канцы жніўня адбылася два такія са смяротным зыходам. У Маларыцкім раёне паляўнічы застрэліў рыбака, выпускаючы зарад шроту, як яму здалося, па дзічыне ў чароце. У Пружанскім раёне на кукурузным полі паляўнічы падстрэліў напарніка, зрэагаваўшы на шоргат. Больш за тое, у першым выпадку паляўнічы з'ехаў з месцы здарэння, а ў другім гаворка ідзе пра незаконную здабычу жывёлы пры дапамозе незарэгістраваных стрэльбаў. А дагэтуль парушальніка таксама штрафавалі.

Зброя — крыніца павышанай небяспекі. Калі парушыў, ды яшчэ і неадноўчы, — сапраўды, адказвай па ўсёй строгасці!

**Серафім,** *Мінская вобл.*

### С. БУСЬКО. «ЗАРАЗ ГЭТАЕ ПЫТАННЕ НЕ РАЗГЛЯДАЕЦЦА» *(«Звязда» за 6 верасня)*

— Чаму падзялілі людзей, якія маюць права на працоўную пенсію па ўзросце, па гадам іх нараджэння? Чым адрознівацца грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які нарадзіўся 30 чэрвеня, ад грамадзяніна, які нарадзіўся 1 ліпеня таго ж года? Атрымліваецца, што тыя, хто нарадзіліся ў першай палове года, будуць выходзіць на пенсію з павелічэннем пенсійнага ўзросту на паўгода за кожны каляндарны год, а тыя, хто нарадзіліся ў другім паўгоддзі, — з павелічэннем на год.

А тыя пенсіянеры, якія працуюць, згодна з заканадаўствам, атрымліваюць сваю пенсію па паніжаным каэфіцыенце — 1,3 (а гэта да 25% ад памеру пенсіі). Пры гэтым пенсіянеры не вызваляюцца ад падатку ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Атрымліваецца, што працоўныя пенсіянеры вымушаны плаціць двойчы за сваё права працаваць — праз неатрыманне сваёй заробленай пенсіі ў поўным аб'ёме і праз выплату падаткаў на падтрыманне пенсійнага фонду!

**Алеся Пінчук,** *г. Брэст.*

### В. ПУСТАВІТ. «ШЧАСЛІВЫЯ РАЗАМ. УВАСЬМЯРЫХ!»

*(«Звязда» за 8 верасня)*

— Дзякуй, што пішаце ў «Сямейнай газеце» пра розных, у тым ліку і экзатычных, хатніх гадаванцаў. А фотаздымкі якія прыгожыя — вачэй не адарваць!

Мы з сынам жывём у аднапакаёвай кватэры, таму, хоць я і люблю жывёл, доўгі час завесці каго-небудзь не адважвалася. Хоць Арцём ужо даўно прасіў сабаку. І вось год таму ў нас з'явіўся Чэйз. Падабралі яго ля свайго пад'езда, нехта падкінуў. Цяпер я на свайго Арцёмку не нарадуюся. Прачынаецца шторанку перад школай, каб выгуляць сабаку, тое ж самае робіць у абед і вечарам. Калі ездзіў у летнік на два тыдні, дык кожны дзень па некалькі разоў тэлефанаваў і пытаўся, як Чэйз. Сын стаў больш адказным, пунктуальным, чулым.

Набываю корм і лекі сабаку заўсёды ў адной і той жа заакраме, што побач з домам. Люблю туды прыходзіць, бо там працуюць цудоўныя кансультанты. Заўважыла, што ў заакрамах звычайна вельмі ветлівае абыходжанне з пакупнікамі, чаго, на жаль, не скажаш пра крамы для людзей. Амерыканцы славяцца сваімі «дзяжурнымі» ўсмешкамі, але менавіта ў сферы абслугоўвання нам іх вой як не хапае!..

**Ірына,** *г. Віцебск*

■

# Хто вышэйшы «ростам»?

## БДУ ўзняўся ў рэйтынгу на 70 пазіцый

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт умацаваў свае пазіцыі ў рэйтынгу найлепшых універсітэтаў свету па версіі ўплывовага брытанскага агенцтва QS (THE — QS World University Rankings) і перамясціўся адразу на 354-ы радок.**

Трэба адзначыць, што БДУ паляпшае свае пазіцыі ў прэстыжным міжнародным рэйтынгу чацвёрты год запар. У 2013 годзе ён знаходзіўся на 551-м месцы, у 2014-м — на 491-м, у 2015-м размясціўся ў групе ВНУ, якія займалі 421—430 пазіцыі.

Рэйтынг QS грунтуецца на аналізе звестак аб вышэйшай навучальнай установе. Ацэньваюцца такія паказчыкі, як індэкс цытавання навуковых работ за пяць апошніх гадоў, суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, колькасць замежных студэнтаў і выкладчыкаў, вынікі апытання экспертаў (акадэмічная рэпутацыя) і працадаўцаў.

Акрамя Белдзяржуніверсітэта, у рэйтынг QS з беларускіх ВНУ трапіў толькі Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт: ён знаходзіцца ў групе 701+.

У верхняй частцы табліцы традыцыйна дамінуюць універсітэты ЗША і Вялікабрытаніі. На першым месцы ў абноўленым рэйтынгу размясціўся Масачусецкі тэхналагічны інстытут (ЗША), за ім ідуць Стэндфардскі і Гарвардскі ўніверсітэты (ЗША). Кембрыджскі ўніверсітэт (Вялікабрытанія) размясціўся на чацвёртай пазіцыі, а Каліфарнійскі тэхналагічны інстытут — на пятай. Аднак, як адзначаюць складальнікі рэйтынгу, хуткі рост дэманструюць навучальныя ўстановы Азіі. Так, у топ-15 увайшоў Нацыянальны ўніверсітэт Сінгапура.

У рэйтынг QS 2016 года ўключаны ўніверсітэты з 80 краін. Сярод 200 найлепшых ВНУ прадстаўлены ўстановы з 34 краін, уключаючы ЗША, Вялікабрытанію, Расію, Бразілію, Францыю, Канаду і іншыя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## Падпіска-2016

# СУСТРЭНЕМСЯ Ў КАРЭЛІЧАХ

Восень крочыць па Беларусі — рассыпае фарбы і песціць цеплынёй. Звяздоўцам у такую насамрэч залатую пару не сядзіцца на месцы. Мы зноў распачалі свае вандроўкі і выстройваем маршруты такім чынам, каб спаткацца са сваімі чытачамі ў самых розных кутках нашай краіны.

Літаральна ўчора душэўная сустрэча адбылася ў цэнтральным рэгіёне Беларусі — у Бярэзінскім раёне. А ўжо ў аўторак мы накіруемся ў Гродзенскую вобласць — дакладней, у Карэліцкі раён. Гэтыя мясціны адметныя слаўнай мінуўшчынай (чаго адзін толькі легендарны замкавы комплекс у Міры варты!) і не менш значнымі поспехамі дня сённяшняга. Таму, як у вядомай песні, нам туды дарога. Спадзяёмся, што сустрэнем сяброў і аднадумцаў, захаваем цяперашніх і набудзем новых прыхільнікаў нашай газеты. Такім чынам, **Дзень падпісчыка «Звязды» пройдзе 13 верасня з 11 да 14 гадзін** на Карэліцкім раённым вузле паштовай сувязі. Завітайце — варта пабачыцца!

## Май на ўвазе

# Усе — на кірмаш!

## Фізасобам выдзеляць месца для продажу сельгаспрадукцыі



У Мінску да восеньскіх кірмашоў ужо гатовыя. Усім, хто хоча прадаць сваю садавіну і агародніну, у сталіцы дадуць каля 5,5 тысячы месцаў. Толькі на рынках сталіцы для фізічных асоб ужо маецца 3 тысячы месцаў для рэалізацыі сельгаспрадукцыі. Астатнія месцы выдзеляць дадаткова. Таксама згодна з рашэннем Мінгарвыканкама гэтай восенню ў перыяд масавага збору ўраджаю і нарыхтовак фізічным асобам і фермерскім гаспадаркам будзе прадастаўлена магчымасць гандляваць з аўто на 195 пляцоўках, размешчаных у раёнах горада. А гэта дадаткова яшчэ каля 1 тысячы месцаў.

Акрамя таго, у Мінску працуюць 15 рынкаў, на якіх сельгаспрадукцыю разам з юрасобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі могуць прадаваць і сяляне, фермерскія гаспадаркі, а таксама фізасобы, што маюць лішкі вітамінных прадукцыі з уласных участкаў. Пры гэтым з аўто магчыма рэалізоўваць яе на пяці рынках — Камароўскім, у Ждановічах, Чыжоўскім, ва Уруччы і «Ракаўскім кірмашы». Так, на Чыжоўскім рынку паводле экспліцацыі выдзелена 37 машына-месцаў. На Камароўскім рынку з аўтамашын продаж дазволены на пляцоўцы ў 10 месцаў. Таксама месца для рэалізацыі жывой рыбы ў сувязі з сезоннай незапатрабаванасцю часова перадалі пад продаж сельгаспрадукцыі. А гэта яшчэ 10 месцаў для фізічных асоб.

**Начальнік упраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ніна ЕМЯЛЬЯНАВА** адзначыла, што на ўсіх рынках горада пенсіянерам і інвалідам месцы для продажу сельгаспрадукцыі (да 20 кг) прадастаўляюцца бясплатна. На Камароўскім рынку штодзень каля 40 месцаў выкарыстоўваецца гэтай катэгорыяй грамадзян. На рынку ў Ждановічах маецца 369 машына-месцаў, з якіх ад 100 да 150 незапатрабаваны штодзень.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### СТВАРЫ ПРАЕКТ МУЗЕЯ ПАЖАРНАЙ СЛУЖБЫ

Працаваць над яго дызайнам прапануюць «з агеньчыкам»

**Мінскае абласное ўпраўленне МНС абвясціла конкурс на найлепшую мастацкую канцэпцыю стварэння Музея гісторыі пажарнай службы Мінскай вобласці, на найлепшы дызайн-праект.**

У распараджэнні творчых людзей будзе памяшканне з цаглянымі сценамі пэўных памераў. Ад крэатыўных распрацоўшчыкаў праекта чакаюць нечаканых, нават шакіруючых (у добрым сэнсе гэтага слова) рашэнняў, дызайнерскіх задум, якія вобразна і ярка адлюструюць гісторыю пажарнай службы Міншчыны. У абласным упраўленні МНС кажуць, што будуць рады, калі ўдзельнікі конкурсу зробяць акцэнт на высокія інфармацыйныя тэхналогіі, гульню з прасторай, святлом і гукам. Творчыя работы ў любым выкананні прымаюцца да 20 верасня на электронны адрас minobl@mchs.gov.by. Самае галоўнае: найлепшы праект на погляд членаў журы атрымае сур'ёзнае грашовае заахвочванне.

### НОВЫЯ ЛЯСЫ НА ПЛОШЧЫ 5 ТЫСЯЧ ГЕКТАРАЎ

**З другой паловы верасня лясгасы краіны прыступяць да пасадкі лесу на ўчастках, якія былі пашкоджаны ветрамі і іншымі стыхійнымі бедствамі.**

— Зараз спецыялісты лясной гаспадаркі занятыя агляддам лесасек, іншымі словамі, ідзе праверка правільнасці высечак і расчысткі, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі. — Распрацаваны графікі правядзення апрацоўкі глебы пад пасадку лясных культур і лесааднаўлення. Восенню плануецца пасадзіць новы лес на тэрыторыях, пашкоджаных у выніку ветраў і снегаломамі, на плошчы звыш пяці тысяч гектараў.

### ТЫ «РЫБАЧКА», Я «РЫБАК»...

Хаўруснікі «злавілі» сабе артыкул

**У Гомелі на возеры-затоцы ракі Сож дзяржінспектары затрымалі жыхара абласнога цэнтра, які браканьерыў пры дапамозе сетак, і яго хаўрусніцу.**

У той час як мужчына арудаваў сеткамі ў вадаёме, жанчына з ліхтарам сачыла за наваколлем. Браканьераў заўважылі рыбакі і паведамілі пра іх дзяржінспектарам. Злоўленыя з доказамі віны, парушальнікі прызналі сваю віну. Трыма сеткамі яны паспелі вылавіць 25 кілаграмаў рыбы. Буйны незаконны ўлоў стаў падставай для заведзення ў дачыненні да гамяльчан крымінальнай справы. У якасці пакрыцця нанесенай прыродзе шкоды ім давядзецца выплаціць 4158 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### ШПАЛЕРЫ З ЗАНІЖАНЫМ КОШТАМ МЯЖУ НЕ ПРАЕХАЛІ

**Няўдалай аказалася спроба імпарцёра знізіць мытныя плацяжы больш чым на 14 тысяч беларускіх рублёў.**

Грузавы аўтамабіль «Рэно» накіроўваўся з Літвы на мытную тэрыторыю ЕАЭС праз пункт пропуску "Бенякон і" Гродзенскай рэгіянальнай мытні з таварам «камплектуючыя сістэмы кандыцыяніравання паветра» і «шпалеры». Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з кантрабандай і адміністрацыйнымі мытнымі правапарушэннямі праверылі і аказалася, што кошт больш чым 1 тысячы рулонаў шпалер заніжаны ў дакументах у 2,5 раза.

— У выніку замест зніжэння мытных плацяжоў шпалеры коштам больш за 59 тысяч рублёў сталі прадметам адміністрацыйнага правапарушэння, і іх далейшы лёс вырашыць суд, — паведаміла **прэс-сакратар Гродзенскай рэгіянальнай мытні Юлія РАМАНЮК.**

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Вынікі і высновы

# ЗАЦВЯРДЖАЛІ ЕАЭС І ЗМАГАЛІСЯ З КАРУПЦЫЯЙ

## 10 знакавых законапрэктаў, прынятых дэпутатамі пятага склікання

**Чатыры гады — жыццё аднаго парламенцкага склікання. За гэты час дэпутаты адстойваюць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў, завязваюць і развіваюць кантакты з замежнымі парламентамі і, што самае галоўнае, — разглядаюць і прымаюць законапраекты. За чатырохгадовы парламенцкі цыкл дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пятага склікання прынялі каля дзвюх соцень законапраектаў, а яшчэ ратыфікавалі больш за дзвесце міжнародных дагавораў. Некаторыя праекты законаў мелі ці тэхнічны, ці даволі вузкі характар, таму не асабліва абмяркоўваліся ў грамадстве. Іншыя ж — наадварот. За або супраць іх прыняцця збіраліся подпісы, пра іх выказваліся палітыкі і проста вядомыя людзі. Прапануем узгадаць 10 найбольш рэзанансных і грамадска значных законапраектаў апошніх гадоў.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### 1. Закон «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, што выхоўваюць дзяцей»

Быў прыняты ў самым канцы 2012 года і ўступіў у сілу ўжо праз некалькі дзён — 1 студзеня 2013 года. Дакумент «прывязаў» памер грашовай дапамогі на дзіця да трох гадоў да сярэдняй зарплаты па краіне. Раней памер дапамогі быў прывязаны да бюджэту пражытковага мінімуму. У выпадку зніжэння сярэднямесячнай зарплаты дапамога на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў не памяншаецца. Затое яна можа вырасці — пасля нараджэння другога дзіцяці.

### 2. Дапаўненні і змены ў Закон «Аб сродках масавай інфармацыі»

Уступіў у сілу 1 студзеня 2015 года.

Галоўная навацыя прынятага парламентарыямі праекта закона ў тым, што да СМІ аднесены любыя інфармацыйныя рэсурсы, якія распаўсюджваюцца праз інтэрнэт і якія змяшчаюць інфармацыйныя паведамленні або матэрыялы. Новая рэдакцыя закона надзяліла інтэрнэт-рэсурсы правамі і абавязкамі сродкаў масавай інфармацыі. Пры гэтым ніякіх дазвольных працэдур, у тым ліку дзяржаўнай рэгістрацыі, для такіх рэсурсаў не патрабуецца.

Згодна з дапаўненнямі і зменамі, уладальнік сайта павінен будзе кантраляваць не толькі інфармацыю, што публікуецца яго рэдакцыяй, але і паведамленні, якія размяшчаюцца на інфармацыйным рэсурсе карыстальнікамі. Так, уладальнікі тых жа сайтаў абавязаны не дапускаць выкарыстання іх інфармацыйных рэсурсаў для распаўсюджвання інфармацыі, змест якой супярэчыць патрабаванням закона аб СМІ.

### 3. Ратыфікацыя Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе

Ратыфікацыя гэтага дакумента сама па сабе сур'ёзны крок, а да таго ж дакумент паступіў на разгляд дэпутатаў у няпросты час. Якраз тады, калі Расія вырашыла правярнуць «падатковы манеўр» у нафтавай сферы, у выніку якога наша дзяржава рызыкавала страціць больш за мільярд долараў. Пачаліся перамовы. У нашай краіне ўвязалі ратыфікацыю Дагавора аб ЕАЭС з урэгуляваннем тых пытанняў, што ўзніклі ў сувязі з падатковым манеўрам у суседзяў. У выніку 9 кастрычніка 2014 года дагавор быў ратыфікаваны.

### 4. Закон «Аб барацьбе з карупцыяй»

Ён быў вынесены на грамадскае абмеркаванне ў жніўні 2014 года, прыняты ў другім чытанні ў чэрвені 2015-га, а ўступіў у сілу 24 студзеня гэтага года. Пра яго выказваліся не толькі самі прадстаўнікі ўлады, грамадскія актывісты, але і звычайныя людзі. У выніку прапановы былі сабраны, прааналізаваны, а некаторыя і ўлічаны.

Новы закон аб барацьбе з карупцыяй забараняе прызначаць на кіруючыя пасады асоб, звольненых па артыкулах, якія дыскрэдытуюць (да заканчэння пяці гадоў пасля такога звальнення), а таксама прымаць на дзяржслужбу асоб, якія раней учынілі цяжкае або асабліва цяжкае злачынства супраць інтарэсаў службы або злачынства, звязанае з выкарыстаннем службовай асобай сваіх службовых паўнамоцтваў (бестэрмінова). Акрамя гэтага, чыноўнікам забаранілі весці сямейны бізнес. Палажэнні дакумента прадугледжваюць пазбаўленне службовых асоб-карупцыянераў пенсій за выслугу гадоў — ім будуць выплачвацца толькі пенсіі па ўзросце.

### 5. Змены ў Выбарчы кодэкс

Былі ўнесены ў 2013 годзе. Рэдакцыя выбарчага заканадаўства грунтавалася на вопыце мінулых выбарчых кампаній і рэкамендацыях міжнародных назіральнікаў. Па-першае, новаўвядзенні змяняюць фінансаванне выбарчых кампаній кандыдатаў. Раней для публікацыі перадвыбарных лістовак кандыдатам з бюджэту выдзялялася пэўная сума грошай. Цяпер яна перадаецца не кандыдатам, а выбарчым камісіям. На думку распрацоўшчыкаў, такім чынам выбаршчыкі гарантавана атрымаюць поўную інфармацыю пра ўсіх кандыдатаў. Калі ж кандыдат жадае выдаць уласныя лістоўкі, яму дазваляецца сфарміраваць свой індывідуальны выбарчы фонд. Па-другое, выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў цяпер могуць праходзіць толькі ў адзін тур. Па-трэцяе, забараняецца агітацыя за байкот выбараў. Пачацвёртае, у заканадаўстве з'явілася норма, згодна з якой у сваіх біяграфічных звестках грамадзянін, які балатуецца кандыдатам у дэпутаты, павінен падаць звесткі пра ранейшую судзімасць, калі яна была.

### 6. Змены і дапаўненні ў некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці і падаткаабкладання (прыняты 16 снежня 2013 года)

Галоўнае новаўвядзенне, якое найбольш абмяркоўваецца нават і сёння, — транспартны падатак. Памеры дзяржпошліны на транспарт, якую ўвялі ў краіне з 1 студзеня 2014 года, супастаўныя з замежнымі аналагамі. Пошліна плаціцца за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху. Атрыманыя сродкі накіроўваюцца ў рэспубліканскі і мясцовы бюджэты ў суадносінах 50/50. Іх прызначэнне — фінансаванне работ па будаўніцтве і рэканструкцыі дарог. Сума падатку змяняецца ў залежнасці ад дазволенай максімальнай масы аўтамабіля і складае ад 3 да 10 базавых велічынь за легкавік.

### 7. Новая Ваенная дактрына

Асноўнае адрозненне новай рэдакцыі дактрыны ад мінулай — дабаўлены новы раздзел, прысвечаны акрэсленню асноўных паняццяў, а таксама і абарончаму сектару эканомікі. Так, тлумачыцца, што такое «буйнамаштабная вайна», «лакальная вайна», «незаконнае ўзброенае фарміраванне», «абаронная інфраструктура», «абаронны сектар эканомікі», «перыяд нарастання ваеннай пагрозы», «рэгіянальная вайна», «стратэгічнае стрымліванне», уведзены тэрмін «гібрыдная вайна» (вядзецца не столькі зброяй, колькі сіламі палітычнай прапаганды, тэрору, дэзынфармацыі і эканамічнага ціску на праціўніка). Яшчэ адзін новы раздзел прысвечаны абароннаму сектару эканомікі і ваенна-тэхнічнаму супрацоўніцтву.

Новая Ваенная дактрына больш дэтальна і комплексна раскрывае мэты і напрамкі ваеннай палітыкі нашай краіны, ацэньвае ваенна-палітычнае становішча вакол Беларусі і ў свеце. На аснове гэтага ўдакладняюцца і погляды на вызначэнне знешніх і ўнутраных ваенных небяспек для Беларусі.

### 8. Кодэкс аб культуры

Гэты ўнікальны дакумент прыняты ў другім чытанні ў чэрвені, нядаўна яго падпісаў кіраўнік дзяржавы. На постсавецкай прасторы аналагаў такому кодэксу няма. Кодэкс грунтуецца на дзейных нормах законаў аб культуры, бібліятэчнай справе, народным мастацтве і народных промыслах, творчых саюзах і творчых работніках, кінематаграфіі, музеях і музейным фондзе, ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Дакументам замацавана абавязковасць перадачы ў дзяржуласнасць прафесійна і выпадкова выяўленых археалагічных артэфактаў. Кодэкс змяшчае забарону грамадзянскага абарачэння археалагічных артэфактаў на тэрыторыі Беларусі, за выключэннем іх набыцця, продажу, дарэння, абмену дзяржаўнымі музеямі і навуковымі арганізацыямі. Спрашчаецца парадак прыняцця некаторых кіраўнічых рашэнняў пры ажыццяўленні музейнай, бібліятэчнай дзейнасці і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

### 9. У Крымінальны кодэкс, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях увялі пакаранне за жорсткае абыходжанне з жывёламі

Раней за жорсткае абыходжанне з жывёламі, якое стала прычынай іх смерці або калецтва, а таксама за іх катаванне ў нашай краіне існавала толькі адміністрацыйная адказнасць. Так, у якасці пакарання прадугледжваўся штраф ад 10 да 30 базавых велічынь (адна базавая велічыня сёння складае 18 рублёў) або адміністрацыйны арышт. Цяпер гэтае злачынства караецца грамадскімі работамі, або штрафам, або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам. Але за тое ж дзеянне, учыненае паўторна або групай асоб, можна атрымаць пакаранне ў выглядзе арышту, або абмежавання волі на тэрмін да аднаго года, або пазбаўлення волі на той жа тэрмін. Абаронцы жывёл лічаць, што і гэта пакаранне недастатковае. У той жа час заканадаўцы зрабілі сур'ёзны крок у тым, што тычыцца абароны нашых меншых братоў.

Не так даўно, дарэчы, грамадскае абмеркаванне прайшоў праект асобнага закона «Аб абыходжанні з жывёламі». Сёння ён знаходзіцца ў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве і рыхтуецца да першага чытання. Над ім папрацуюць ужо дэпутаты новага склікання.

### 10. Закон «Аб альтэрнатыўнай службе»

Яго асноўныя палажэнні ўступілі ў сілу 1 ліпеня гэтага года. Новы закон дазваляе групе ваеннаабавязаных беларусаў замест воінскай службы займацца грамадска-карыснай працай. Альтэрнатыўна адслужыць могуць толькі тыя маладыя людзі, якія праз рэлігійныя перакананні не могуць прымаць прысягу і насіць зброю. Яны змогуць праходзіць службу ў арганізацыях аховы здароўя, сацыяльнай сферы, жыллёва-камунальнай, сельскай і лясной гаспадаркі, у арганізацыях, якія займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторый, будаўніцтвам і рамонтам дарог і чыгуначных шляхоў, акрамя таго, такія грамадзяне могуць прыцягвацца да ўдзелу ў ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару. Для асоб з вышэйшай адукацыяй тэрмін службы складзе 24 месяцы, без вышэйшай адукацыі — 36 месяцаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

❍ У тэму

## «ДЗЯКУЙ, ШТО НЕ ХАВАЛІСЯ АД ПРАБЛЕМ»

**Мы пацікавілася ў чытачоў «Звязды», якія з законапраектаў, прынятых дэпутатамі пятага склікання, імі ўспамінаюцца ў першую чаргу.**

***Станіслаў КНЯЗЕЎ, рэктар Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», доктар юрыдычных навук, прафесар:***

— Заканатворчасць — вельмі сур'ёзная праца. Усе прынятыя законапраекты накіраваны на развіццё краіны, на павышэнне дабрабыту людзей. Трэба сказаць «дзякуй» дэпутатам за іх працу, за тое, што не хаваліся ад праблем нават у такі нялёгкі час.

***Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук:***

— Запомнілася тое, што заканадаўства было ўдасканалена ў галіне аховы археалагічных аб'ектаў, што вельмі важна. Напрыклад, былі ўстаноўлены штрафныя санкцыі для чорных капальнікаў.

***Пётр КІСЯЛЁЎ, начальнік аддзела інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генеральнай пракуратуры:***

— Прыняты дэпутатамі пятага склікання Закон «Аб барацьбе з карупцыяй» будзе садзейнічаць удасканаленню барацьбы з гэтым злачынствам, паколькі ў ім улічаны ўсе напрацоўкі мінулых гадоў, а таксама прыняты неабходныя меры па выкараненні недахопаў, якія меліся. Наша заканадаўства ў гэтай сферы з'яўляецца найбольш дасканалым сярод краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Ужо сёлета адзначылася станоўчая тэндэнцыя па скарачэнні колькасці карупцыйных злачынстваў.

***Валянцін ЦАХМЕЙСТАР, дырэктар Рэспубліканскага саюза турыстычных арганізацый:***

— Праца дэпутатаў пятага склікання запомнілася ў першую чаргу канструктыўным супрацоўніцтвам з Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы. Мы разам працавалі над унясеннем паправак у Закон «Аб турызме» — абмяркоўвалі розныя прававыя нюансы з дэпутатамі, прадстаўнікамі Міністэрства спорту і турызму. Такім чынам, адчуваю поўную задаволенасць працай дэпутатаў пятага склікання.

***Вадзім ЗАРУБА, першы сакратар раённай арганізацыі БРСМ:***

— Як кіроўцу мне запомнілася ўвядзенне дзяржаўнай пошліны на транспарт. Таксама магу назваць Кодэкс аб культуры.

***Аляксей ДЗЕРМАНТ, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:***

— Вылучыў бы ў якасці магістральнага прававога акта ў сферы культуры Кодэкс аб культуры. Гэта сапраўды спроба сфарміраваць новае азначэнне культуры. Прыняцце Кодэкса сведчыць аб прагрэсіўнай заканадаўчай дзейнасці.

■ 50+: Жыць цікава

# «І МЫ ЎСЕ ТАКІЯ СВАЕ!»

## У нашай гераіні ў самых розных гарадах былога Савецкага Саюза ёсць каму патэлефанаваць і ў каго спыніцца

**Калі спытаць 65-гадовую Наталлю Хлапкову з Мінска, чым запоўнена яе жыццё, яна адкажа, не задумваючыся: «Сустрэчамі з сябрамі. У мяне іх вельмі шмат! Ну, і вучобай, вядома». Гэта зусім не значыць, што ёй няма чаго рабіць. Ёсць сям'я, муж, унучка, сад-агарод... Але яна ўжо даўно навучылася планаваць свой час — трое дзяцей, жаданне займацца любімымі справамі прымусілі.**

### Пра гаючую сілу мандалы

— Калі чую, што камусьці сумна, заўсёды дзіўлюся. Я вельмі люблю рукадзельнічаць. Нават у бальніцу брала з сабой ніткі і вязала, — распавядае Наталля. — Памятаю, у нас у палаце была адна жанчына — такі ныцік! Ёй усё было дрэнна. Тады я выкарыстала правераны метад. Кажу: пайшлі пагуляем (справа была летам). Недалёка ад бальніцы была прамтаварная крама. Мы пайшлі туды, купілі кручок, ніткі, я папрасіла мужа прывезці з дому некалькі часопісаў... І яна звязала круглую сурвэтку (цяпер такія называюць мандаламі). Мы яе павесілі на акно на круглым дроце (таксама муж мой прывёз)... І, ведаеце, гэтая жанчына «адышла». Яна перастала ныць! Так што рукадзелле валодае вялікай сілай! Але трэба, каб нам самім падабалася тое, што выходзіць з нашых рук.

Дарэчы, знаёмы мастак такой жа думкі. Неяк параіў, калі на душы цяжка, узяць у рукі фарбы і, калі не ўмееш маляваць, проста рабіць рознакаляровыя мазкі на паперы, выплюхваючы такім чынам свае эмоцыі. І арт-тэрапеўты ў адзін голас кажуць, што часам палёгка ад душэўных пакут ляжыць літаральна «на кончыках нашых пальцаў»...

### «Не магу прамаўчаць, калі бачу нешта прыгожае»

Наталля Хлапкова любіць гаварыць людзям, нават незнаёмым, кампліменты. «Мне, напрыклад, іх раней не казалі, — тлумачыць яна. — Ніколі не думала пра сябе, што харошанькая. І адзявалася вельмі сціпла: я са звычайнай сям'і, бацькам было цяжка нас, дзяцей, гадаваць. Затое цяпер адрываюся! Люблю прыгожа апранацца, пераважна ў тое, што зрабіла сваімі рукамі. Ахвотна раблю падарункі... І раздаю кампліменты: дзяўчынцы на аўтобусным прыпынку, сталай жанчыне з добрай стрыжкай... Не магу прамаўчаць, калі бачу нешта прыгожае».



У 65 гадоў ёй і самой хочацца зрабіць камплімент — такой маладжавай, падцягнутай, стыльнай, а самае галоўнае — добразычлівай і ўсмешлівай.

Утерянные свидетельство о государственной регистрации и печать ЧТУП «Лекоинес» (УНП 191690200) **считать недействительными.**



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ**

**ПО ПРОДАЖЕ САНАТОРИЯ «КООПЕРАТОР»**

**(лечебно-профилактический блок со столовой с инв. №600/С-57830, спальный корпус с инв. №600/С-57829, гараж с инв. №600/С-125975, незавершенный незаконсервированный строительством объект (грязелечебница)), расположенного по адресу: Минская обл., Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, район агрогородка Острошицкий Городок, принадлежащего унитарному предприятию «Поречье Белкоопсоюза» (Продавец) на праве хозяйственного ведения**

**Земельный участок площадью 0,9494 га с кадастровым номером 623685200001000048.**

**Начальная цена с НДС – 448 137,11 (4 481 371 100)* бел. руб. Задаток – 44 813,71 (448 137 110)* бел. руб. Шаг аукциона – 5%. *Цена указана в денежных знаках образца 2000 г.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже санатория УП «Поречье Белкоопсоюза»,* **проводимом 28 сентября 2016 г.**

Договор купли-продажи Объекта должен быть заключен в течение 10 (десяти) дней с назначенной даты проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1,0% (Один процент) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 28.09.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.09.2016 до 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.**

Контактное лицо для осмотра объекта: Кишкурно Александр Георгиевич, 8 (029) 377-33-30. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.01.2016. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Организатор аукциона: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 32 (332)

■ Наш Кодэкс

## Комплексны. Актуальны. Сучасны

**Лідзія МАЛЬЦАВА, дырэктар Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Яўхіма Карскага:**



— Тое, што ў нашай краіне прыняты першы ў СНД Кодэкс аб культуры, пацвярджае: сфера культуры знаходзіцца ў полі зроку нашага ўраду, нашай дзяржавы. Раней бібліятэчная справа рэгламентавалася вялікай колькасцю дакументаў, гэта ў тым ліку канцэпцыя развіцця бібліятэчнай справы, палажэнні аб бібліятэчнай справе і краязнаўчай дзейнасці. Цяпер жа пад адной вокладкай кодэкса мы маем самыя неабходныя дакументы, што вызначаюць адметнасці функцыянавання і перспектывы развіцця бібліятэчнай справы ў Беларусі.

Кодэкс яшчэ і тым каштоўны, што ён сучасны. Многія дакументы, якімі галіна кіравалася раней, былі ўстарэлыя. Мы, практыкі, доўгі час прасілі іх абнавіць. І цяпер я пабачыла, што кодэкс змяшчае абноўленыя варыянты тых дакументаў.

Вельмі добра, што кодэксам прадугледжваецца стварэнне Рэспубліканскага бібліятэчнага савета пры Міністэрстве культуры. Правільнае рашэнне, што гэты савет разам з практыкамі будзе ажыццяўляць падрыхтоўку прапаноў па развіцці бібліятэчнай справы, вырашаць актуальныя праблемы, рэалізоўваць сумесныя культурныя праекты. Так, нядаўна ад Гродзенскай вобласці мы прапанавалі стварыць электронную бібліятэку рэдкіх выданняў нашай краіны. Думаю, што рэспубліканскі савет таксама можа гэтую справу каардынаваць і аб'ядноўваць дзейнасць розных устаноў. Калі збяруцца выдатныя спецыялісты бібліятэчнай справы, Міністэрства культуры, сумежных структур, яны змогуць аказаць вялікую дапамогу ў развіцці бібліятэк краіны.

Кодэксам устанаўліваюцца прававыя, арганізацыйныя, эканамічныя і сацыяльныя асновы бібліятэчнай справы. Тут усё прадугледжана: правядзенне мерапрыемстваў, камплектаванне фондаў, даецца азначэнне рэдкім выданням, нават адзначана заахвочванне спецыялістаў у галіне культуры. Вельмі важна таксама, што вялікае значэнне надаецца ў кодэксе захаванню культурных каштоўнасцяў, развіццю ўстаноў культуры. Істотна, што гэты комплексны дакумент прадугледжвае даступнасць дасягненняў культуры для насельніцтва краіны

■ Вернісаж

## Каменныя дзівосы Зузаны Рудаўскі

### Аўтарка гальштука для цырымоніі «Оскара» прывезла да нас «Белае прывітанне»

**Адкрыццё выстаўкі славацкай мастачкі Зузаны Граус Рудаўскі «Дотык Славакіі. Малюнак. Аб'ект. Каштоўнасць» было прымеркавана да дзвюх істотных для Славакіі падзей: Дня канстытуцыі краіны (які сцвярджае, — 24 гады таму краіна аддзялілася ад Чэхіі і пачала самастойнае існаванне) і першаму ў гісторыі старшынству Славакіі ў Савеце Еўрапейскага саюза, якое распачалося ў ліпені гэтага года.**

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Славакіі ў Беларусі Ёзэф Мігаш падкрэсліў, што гэтыя падзеі важныя для яго радзімы. Колькі слоў было сказана і пра развіццё стасункаў паміж нашымі краінамі: пра згадаў Дні Славакіі, што праходзілі ў Віцебску падчас «Славянскага базару», Беларуска-славацкі прадпрымальніцкі форум. Намеснік міністра замежных спраў Беларусі Алена Купчына таксама завітала на ўрачыстае адкрыццё. Яна адзначыла: «Славакія — маладая незалежная краіна, якая мае вельмі глыбокія карані і традыцыі мастацтва. Менавіта на гэтых каранях вы грунтуеце сучаснае інавацыйнае мастацтва, што робіць яго надзвычай цікавым».



Фота Віктара АСКЕРА.

**Хрустальная мара, 2012 г.**

Сапраўды, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Славакіі, якое прадставіла для беларусаў Зузана Рудаўска ў галерэі «Універсітэт культуры», — з'ява выключная. Яна працуе ў некалькіх самастойна вынайдзеных тэхніках, сумяшчае ў творчасці класічныя асновы з аўтарскім наватарствам і ніколі не забываецца пра навакольнае асяроддзе. Яе моцная светлая энергетыка адбіваецца ва ўсіх малюнках, аб'ектах, скульптурах, упрыгажэннях выстаўкі. Нездарма спадарыня Зузана надае шмат увагі матэрыялам, з якіх стварае свае аб'екты:

— Я павінна асабіста дакрануцца да матэрыялу, адчуць яго энергетыку, — тлумачыць свой падыход да справы мастачка. — Матэрыял ёсць натхненне, таму я заўсёды выкарыстоўваю толькі натуральныя камяні, металы, тканіну.

Зузана Рудаўская любіць падарожнічаць. Яе падарожжы дадаюць творчасці шмат карыснага: гэта і новыя камяні, выпадкова ўбачаныя ў маленькіх крамах па ўсім свеце, і новыя ідэі. Так, падчас візіту ў Японію ў арсенале мастачкі з'явіліся незвычайныя аб'ёмныя палотны з паперы ручнога вырабу. Штуршком для распрацоўкі такой тэхнікі стала наведванне японскай вёсачкі, дзе сяляне традыцыйна займаліся папяровай вытворчасцю.

Работы спадарыні Зузаны запатрабаваны не толькі ў межах галерэй і прыватных калекцый, але і ў штодзённым жыцці. Каштоўныя ўпрыгажэнні, якія на пачатку сваёй кар'еры мастачка рабіла выключна для сябе, хутка зацікавілі людзей. Цяпер ювелірнае майстэрства — яшчэ адзін напрамак яе дзейнасці, але кожны такі выраб унікальны і ў першую чаргу з'яўляецца творчым аб'ектам. Зузана Рудаўска мае дачыненне і да кіно: яна супрацоўнічала з кампаніяй Warner Brothers, а на пачатку 1990-х італьянскі акцёр і рэжысёр Раберта Беніньі выйшаў на чырвоную дарожку «Оскара» у гальштуку з металу, які зрабіла для яго славацкая мастачка.

Беларусаў на выстаўцы чакае асаблівы падарунак: на адной са сцэн галерэі «Універсітэт культуры» змешчана незвычайная карціна. «Белае прывітанне для Белай Русі» — такую назву мае твор, падрыхтаваны Зузанай Рудаўскай для нашай краіны падчас яе першага візіту ў 2002 годзе.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Пашана

# ВЕЧНАСЦЬ ПАТРЫЯРХА

### Скульптурнае ўвасабленне вобразу Свяцейшага Патрыярха Аляксія II уганаравана прэміяй Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва

**Прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва сёлета атрымалі два беларускія аўтарскія калектывы. Адзін з іх, у складзе спевака Анатоля Ярмоленкі, кампазітара Алега Елісеенкава і паэта Івана Юркіна, да публічнасці і прадстаўлення на сцэне ўжо звыклы. Іх аўтарству належыць дыск з песнямі «Дзе каліна цвіла...».**

**А вось іншая група творцаў — аўтар ідэі, архітэктар, протаіерэй, настаяцель Усіхсвяцкага прыхода ў Мінску Фёдар Поўны; скульптар, прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Слабодчыкаў; архітэктар, доктар культуралогіі, прафесар Ігар Марозаў — да шырокай увагі грамадскасці пакуль толькі прывыкае. Ды і нагода для атрымання імі прэміі не зусім гучная, грамадска-рэзанансная, а хутчэй глыбока-духоўная і сімвалічная. Менавіта гэты калектыў — аўтары і выканаўцы ідэі ўстаноўкі помніка Свяцейшаму Патрыярху Аляксію II у Мінску, каля храма Усіх Святых.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выбар месца для размяшчэння помніка Свяцейшаму Патрыярху ў беларускай сталіцы быў не выпадковым. Аляксій II тры разы наведваў Беларусь і кожны раз прыязджаў да гэтага храма. Тры прыступкі на пастаменце, на якім стаіць фігура патрыярха, адлюстроўваюць колькасці яго візітаў у Мінск. Ёсць сімвалізм і ў размяшчэнні фігуры. Здаецца, што помнік стаіць спінай да гледачоў, але калі мы падыходзім да галоўнай лесвіцы царквы, то бачым разам з патрыярхам набліжаемся да храма, узднімаемся па прыступках да сабора. Аляксій II нібыта благаслаўляе храм.

— Мне думаецца, што ў гэтым — выдатнае адкрыццё архітэктара, настаяцеля Усіхсвяцкага прыхода ў Мінску Фёдара Поўнага, — разважае **скульптар Уладзімір СЛАБОДЧЫКАЎ**. Менавіта ён працаваў над увасабленнем вобразу патрыярха спачатку ў гліне, а потым у бронзе. — З аднаго боку, мне было вельмі складана працаваць над гэтай фігурай. Я ж не бачыў патрыярха Аляксія II у жыцці, а трэба было зрабіць не проста помнік, але партрэтную фігуру. Таму перадусім варта было прытрымлівацца падабенства, а ўжо потым — працаваць над вобразнасцю. У гэтым мне вельмі дапамог айцец Фёдар, ён падказваў дакладныя моманты, характэрныя рысы патрыярха як чалавека. За час працы над вобразам я пераглядзеў больш як тры тысячы фотаздымкаў Аляксія II у інтэрнэце, таму дасягнуць знешняга падабенства было нескладана, а вось паказаць унутраны характэрны стан я сам не мог. Калі пачаў глядзець глыбей, вывучаць вобраз, жыццё патрыярха, ён мяне вельмі ўразіў. Гэта быў няпросты чалавек, які рухаўся па сваім прызначэнні. Пры ім адбыліся значныя падзеі ў жыцці Рускай Праваслаўнай Царквы. Безумоўна, шмат спраў ён зрабіў настолькі пазітыўных, настолькі вялікіх, што гэта не магло не адлюстравацца ў яго скульптурным вобразе.

> **ЦІКАВА:** Усяго ў свеце сёння налічваецца толькі тры помнікі Свяцейшаму Патрыярху Аляксію II. Першы быў устаноўлены ў Маскве, другі — у Таліне, трэці — у беларускай сталіцы. Аналагаў мінскай скульптуры пакуль не існуе.

У той жа час скульптар прызнаецца, што меў справу з увасабленнем не звычайнага чалавека, а Свяцейшага Патрыярха. Таму і ў прадстаўленні яго вобразу нельга было пазбегнуць пэўных кананічных патрабаванняў. Але выбар паказаць Аляксія II у манаскай расе замест поўнага патрыяршага адзення даў магчымасць зрабіць больш свабодныя пластычныя хады, больш увагі звярнуць на пошук стылістыкі, формы, пластыкі фігуры.

— Разам з тым варта памятаць, што гэтая скульптура — не проста помнік, які адзінока стаіць у пэўным месцы, — кажа Уладзімір Іванавіч. — Ён размешчаны каля сабора, таму па задумцы архітэктара Ігара Марозава мы прыйшлі да ансамблевага рашэння, у якім спалучылі скульптуру з будынкам царквы. Атрымалася вельмі цікавае адкрыццё.

Уладзімір Слабодчыкаў з ахвотай распавядае пра задумку помніка і рэалізацыю ідэі, прыгадвае таксама і момант асвячэння фігуры патрыярха:

— Работа ішла досыць доўга, каля двух гадоў. Але праца падобнага маштабу ў галіне манументальнай скульптуры хутка не робіцца. Фігуру асвячаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, ён прыехаў да нас у скульптурны камбінат. Было холадна. Помнік з гліны таксама нібыта выпраменьваў холад. І вось мітрапаліт падышоў да скульптуры, доўга яе вывучаў. Ён жа бачыў Аляксія II, помніць яго жывым. Потым наблізіўся, абняў гліняную фігуру, і стала неяк цяплей, я зразумеў, што наша работа легла яму на душу і спадабалася.

А паколькі гэты помнік атрымаў такую высокую міждзяржаўную ўзнагароду, то можна казаць пра тое, што скульптура прыйшлася да душы многім, у тым ліку экспертнай камісіі па прысуджэнні прэміі Саюзнай дзяржавы. Сам Уладзімір Слабодчыкаў кажа, што такое шырокае грамадскае прызнанне дае ўпэўненасць: творчасць рухаецца і развіваецца па правільным шляху. Ён кажа:

— У нашым асяроддзі гэтая прэмія лічыцца вельмі значнай, прэстыжнай. Яе ў свой час атрымлівалі Леанід Шчамялёў, Георгій Паплаўскі, Іван Міско, Міхаіл Савіцкі, Аляксей Дудараў. Узнагарода наватперасягае межы Беларусі, паказвае, што праект значны для ўсёй Саюзнай дзяржавы. Каб яе прысудзілі, работа павінна быць выканана на вельмі высокім узроўні. Прэмія пацвярджае: справы, якія ты робіш, успрымаюцца не толькі табой і вузкім колам, але і шырокай грамадскасцю, кіраўніцтвам дзяржавы. І тое, што прэмію падчас «Славянскага базару ў Віцебску» нам уручыў кіраўнік дзяржавы, паказала: яна значная для народа, кіраўніцтва краіны і для цябе асабіста.

Зрэшты, як прызнацца майстар, з ліку іншых сваіх работ фігуру Свяцейшага Патрыярха Аляксія II ён не вылучае. Нават крыху жартуе на гэты конт:

— Калі ў сям'і пяцёра дзяцей, немагчыма выбраць самага любімага. Так і з работамі: калі ты аддаваў сябе працы, то ставішся да ўсіх скульптур аднолькава, іх нават параўнаць нельга. Кожны твор нечым дарагі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ На сцэне

# О, МАРФА

## Оперная «зорка» сыграла ў «Царскай нявесце» ў Вялікім тэатры оперы і балета

**Надзея Кучар, уладальніца тытула «Спявачка свету» па выніках найпрэстыжнейшага конкурсу оперных спевакоў BBC за 2015 г. «Кардыфскія галасы», прыехала ў родны Мінск, каб выканаць ролю Марфы ў «Царскай нявесце» Рымскага-Корсакава. Галоўную жаночую ролю яна сыграла на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета 8 верасня. Гэтая опера стала першай сур'ёзнай працай у асабістай кар'еры Надзеі, партыю Марфы сярод іншага спявачка выконвала перад журы ў St. David's Hall у Кардыфе. Напярэдадні выступлення ў Мінску Надзея Кучар сустрэлася з журналістамі і расказала пра ўдзел у «Кардыфскіх галасах», сваю работу і калекцыю галасоў.**



Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.

Не так даўно оперная «зорка» дала сольны канцэрт «Дзень белых хрызантэм» у мінскай зале «Верхні горад». «Гэты канцэрт я рыхтавала для Лондана, думала, што ў Мінску парэпетую, але захварэла, графік памяняўся і атрымалася так, што ў Лондане я рэпетавала для Мінска».

У гэты раз на «свой родны Аўтазавод», дзе нарадзілася і вырасла, Надзея Кучар вярнулася з Чылі, дзе два месяцы працавала ў Тэатры оперы і балета Санцьяга. «Ён адзін з нямногіх, што займаецца менавіта класічнымі варыянтамі. Усе спектаклі быццам сыходзяць з карціны, гэта вельмі прыгожа. Каманды тут фарміруюцца з запрошаных удзельнікаў, я працавала над операй «Танкрэд» Джаакіна Расіні, яна сёння мала дзе ставіцца».

Надзея скончыла Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі. «У беларускай музычнай адукацыі вельмі высокі ўзровень, я ёй заўсёды хвалюся. На музыказнаўстве я атрымала добрую базу, што сёння на працы мне шмат у чым дапамагае. Мне крыху лягчэй, чым іншым спевакам, якія такой адукацыі не маюць». За плячыма спявачкі таксама Санкт-Пецярбургская кансерваторыя імя Рымскага-Корсакава. «У школьныя часы ў мяне быў настаўнік, які шмат уклаў у маю галаву, апроч іншага ён казаў: «Калі ты будзеш спяваць, а ты павінна спяваць, то вучыцца трэба ехаць толькі ў Санкт-Пецярбург». Гэта засела ў маёй галаве, і я паехала ў Піцер».

У 2012 годзе Надзея стала салісткай Пермскага тэатра оперы і балета імя Чайкоўскага, дзе дэбютнай роляй стала якраз Марфа з «Царскай нявесты». «У Пярмі я шмат працавала з дырыжорам Тэадорам Курэнтзісам. Пасля гэтай школы, якую я атрымала падчас працы з ім, на пастаноўках у Еўропе ў мяне не ўзнікае ніякіх праблем. Я прыязджаю ўжо гатовай, з прадуманымі найдрабнейшымі дэталямі — такая вышкаленасць у плане падрыхтоўкі матэрыялу. Звычайна ўсіх задавальняюць варыянты роляў, што я прапаную. Усё дзякуючы працы з гэтым страшным перфекцыяністам, які пасяляе ў табе імкненне да дасканаласці. Ад гэтага мы, праўда, крыху і пакутуем, таму што хочацца ўсё рабіць ідэальна, а ідэалу няма».

Пермскі тэатр удзельнічаў у пастаноўцы «Каралевы індзейцаў» Генры Пёрсэла амерыканскім рэжысёрам Пітэрам Сэларсам, а Надзея Кучар за ролю Донны Ісабэль атрымала «Залатую маску». «У мяне яшчэ не вялікі вопыт, але з тых, з кім давялося працаваць, я магу адзначыць рэжысёра Пітэра Сэларса, з ім мы зрабілі праслаўлены спектакль «Каралева індзейцаў», які ўсё проста ўзарваў. На сённяшні дзёнь гэта для мяне самая памятная работа. Я не магу патлумачыць, як Сэларс працуе, — ён мае свой выключны стыль. У адрозненне ад традыцыйнай рэжысуры ён выстройвае камунікацыю праз нейкія вышэйшыя матэрыі. Ты павінен убачыць асацыяцыю, глыбока яе адчуць і пры дапамозе голасу і пластыкі цела вынесці аўдыторыі. Яго пастаноўкі трэба бачыць. Сэларс надае сімволіку мове цела спевака; мне здаецца, у яго ёсць нейкая асабістая рэлігія, якую ён праз музыку, акцёраў, увогуле спектакль праецыруе на гледачоў. І гэта робіць вялікае ўражанне, не пакідае абыякавым нікога».

У фінал конкурсу оперных спевакоў BBC у Кардыфе спявачка трапіла не з першага разу. «Я дасылала свае запісы яшчэ ў 2013 годзе і прайшла на другі тур (жывое праслухоўванне), але ў фінал мяне не пусцілі. У конкурсе тады перамагла выдатная амерыканская вакалістка, меца-сапрана Джэймі Бартан. Я больш не хацела ўдзельнічаць, але мне прыйшоў ліст ад арганізатараў конкурсу. Заставалася мала часу да дэдлайну, і я паслала тое, што ў мяне было. На гэты раз прайшла на жывое праслухоўванне, а потым у фінал. У Кардзіфе я намінавалася ў дзвюх катэгорыях — опера і песня. Потым падумала, што лепш было сябе паберагчы, таму што гэта вялікія нагрузка і нервовае напружанне. Спяваць можна было што заўгодна, галоўнае — укласціся ў рэгламент, але вельмі важна было правільна падабраць рэпертуар, таму што «Кардзіфскія галасы» — не проста вакальны конкурс, але і шоу для публікі. Толькі пераступаеш парог St. David's Hall, камера ад цябе не адыходзіць. Здымаюць, як ты распяваешся, кожны дзень даводзіцца даваць інтэрв'ю, на сцэне вакол лётае неверагодная колькасць камер. Многія псіхалагічна не вытрымліваюць такога ціску. Быў адзін бас з Германіі, хлопец ростам два метры. Калі ён толькі выйшаў спяваць, я ўбачыла гэта на праекцыі, бо зала велізарная — у яго па твары пацёк пот, былі абсалютна непрытомныя вочы, хлопца калаціла. Ён зляцеў, псіхалагічнае напружанне шмат каму не дае выступіць на сто працэнтаў».

«Рымскага-Корсакава ў Еўропе не ведаюць увогуле. Дырыжор, што быў на конкурсе ў Кардзіфе, — англічанін, які скончыў піцерскую кансерваторыю, але ён ніколі не чуў «Царскую нявесту». Гэта для іх не руская класіка, а «дзіва», як для нас «Танкрэд» Расіні. Хоць там гэта таксама рэдкі рэпертуар. З рускіх кампазітараў у асноўным выконваецца Пётр Чайкоўскі: на першым месцы па папулярнасці «Яўген Анегін», набірае абароты «Іаланта», можна пачуць «Пікавую даму». Рымскага-Корсакава няма, яго музыку ніхто не ведае, таму спяваць «Царскую нявесту» на конкурсе было рызыкоўна. Але куды падзецца: праграма заяўлена, мяняць нельга. У выніку аказалася, што менавіта «Царская нявеста» ўразіла больш за ўсё, народ быў агаломшаны, а старшыня журы сказаў: «Я не ведаў, што існуе такая прыгожая музыка».

Надзея Кучар, што ндзіўна, любіць галасы. «Галасы ў мяне выклікаюць захапленне, некаторыя мяне ўзносяць, можна сказаць, я іх калекцыяную ў галаве. Большасць, на жаль, існуе толькі ў запісах, і мара пачуць у рэальнасці не спраўдзіцца ніколі, бо іх уладальнікаў ужо няма, — гэта, напрыклад, Франка Карэлі, Джузэпэ Джакаміні. Але ўжо нават запісы неверагодныя. Джаан Сазэрленд — увогуле адна з прычын, чаму я імкнулася ў Кардыф: яна была патронкай конкурсу і яго сэрцам».

Магчыма, «спявачка свету» Надзея Кучар на еўрапейскіх сцэнах будзе выконваць беларускую музыку: «У мяне шмат заказаў на песенныя канцэрты. У рэпертуар хочацца ўключыць нешта асаблівае, што рэдка дзе пачуеш, — з гэтых меркаванняў мне падыходзіць беларуская музыка. Можна яе такім чынам прапагандаваць».

... І еўрапейскую на сцэне беларускай: «Ніколі не спявала «Рыгалета» Вэрдзі, ролю ведаю, а скарыстаць гэта пакуль не магу. А тут у рэпертуары гэта опера ёсць».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

*katsyalovich@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# ПЕСНІ СТАРОЙ ЕЎРОПЫ



## Фільм пра беларускі фальклор перамог на кінафестывалі ў Канадзе

**Дакументальны фільм «Песні старой Еўропы — старажытныя беларускія народныя песні», зняты беларускай Вольгай ДЗЕМКАЙ, якая ўжо больш за дзесяць гадоў жыве ў ЗША, стаў пераможцам міжнароднага кінафестывалю Creation International Film Festival CIFF-2016 (Канада).**



Рэжысёр і прадзюсар фільма Вольга Дземка прыгадвае, што, хоць яна нарадзілася і вырасла ў Мінску, але шмат часу бавіла ў палескай вёсачцы, дзе жылі баба з дзедам, і там літаральна закахалася ў беларускія народныя песні. Некалькі гадоў дзяўчына сама спявала ў фальклорным калектыве Guda, а перабраўшыся ў 2003 годзе ў амерыканскі Сіэтл, заснавала там уласны гурт архаічных беларускіх народных спеваў Volya. У ЗША беларуска скончыла Інстытут мастацтваў па спецыяльнасці «камерцыйная фатаграфія», пэўны час працавала аператарам-пастаноўшчыкам, асістэнткай рэжысёра, рэжысёрам і прадзюсарам каротකаметражных фільмаў, музычных кліпаў і рэкламных ролікаў, а пазней прыступіла да рэалізацыі ўласнага праекта аб знікаючых культурных традыцыях Беларусі «Песні старой Еўропы». Дзеля таго, каб зняць гэты фільм, дзяўчыне спатрэбілася дапамога сяброў і аднадумцаў — праз краўдфандынгавую інтэрнэт-пляцоўку больш як паўтары сотні зацікаўленых беларусаў і амерыканцаў зрабілі свае грашовыя ўнёскі. Але іх усё адно не хапіла, і тады Вольга выдаткавала на праект усе сямейныя зберажэнні, а таксама ўзяла крэдыт у банку. «Колькі нам гадоў яшчэ засталося — 10, мо 15, пакуль адыдуць апошнія нашы бабулі, а разам з імі і песні, — тлумачыла Вольга неабходнасць прыспешыць здымкі. — Гэты фільм і праект наогул — з тых, якія робіш, бо не рабіць немагчыма, а часу застаецца ўсё меней».

У 2011 годзе дзяўчына здзейсніла этнаграфічную экспедыцыю па Гомельшчыне і Брэстчыне, дзе пераважна і адбываліся здымкі фільма. Да працы далучыліся кіраўнік этна-трыа «Троіца» Іван Кірчук, лідар гурта «Палац» Алег Хаменка, этнамузыколаг Тамара Варфаламеева, гісторык Сяргей Траццяк, шэраг беларускіх фолк-гуртоў, а таксама тэхнічныя і творчыя прадстаўнікі кінематографа з абедзвюх краін. Вынік — 60-хвілінны фільм, у якім гучаць 102 песні і музычныя кампазіцыі, а таксама з элементамі камп'ютарнай графікі і выкарыстаннем рэдкіх архіўных кадраў пачатку XX стагоддзя — быў прэзентаваны гэтым летам. «Нашы песні — гэта як піраміды для егіпцян, некаторыя з іх нават паходзяць з таго ж часу, але большасцю беларусаў успрымаюцца як нешта непапулярнае ці «калгас», — адзначае Вольга Дземка. — Я веру, што гэта ўсё ад недахопу ведаў, таму і здымала фільм, каб расказаць людзям усяго свету пра нашы песні». Днямі стала вядома, што праект «Песні старой Еўропы — старажытныя беларускія народныя песні» атрымаў прыз міжнароднага кінафестывалю CIFF-2016 як найлепшы поўнаметражны дакументальны фільм.



www.belarusian-songs.com.

Далей, як плануе рэжысёр Вольга Дземка, фільм працягне падарожнічаць па фестывалях, будзе прэзентаваны шырокай аўдыторыі праз тэлебачанне, а пазней будзе распаўсюджвацца для ўсіх ахвотных праз інтэрнэт па прынцыпе «Назаві сваю цану» — гледачы змогуць паглядзець яго бясплатна, а могуць зрабіць грашовы ўнёсак любога памеру. Пакуль жа на афіцыйным сайце www.belarusian-songs.com даступна ўся інфармацыя пра сам праект, здымачную групу, кадры са здымачнай пляцоўкі, трэйлер і ўрывак з фільма.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# ТВОРЦА ПЕРАМОГІ

...Ёсць два шырока распаўсюджаныя міфы пра Вялікую Айчынную вайну. Першы — што вайна была выйграна дзякуючы выключнаму таленту таварыша Сталіна. Другі — што вырашальную ролю ў перамозе адыграў маршал Жукаў.

Мы не будзем уступаць у спрэчкі з апалагетамі гэтых ідэй, толькі сціпла заўважым: сёння не з'яўляецца сакрэтам, што пралікі і недальнабачнасць правадыра, яго сяброўства з Гітлерам, навучанне нямецкіх афіцэраў у СССР і знішчэнне каманднага складу Чырвонай Арміі ў 1937-1938 гадах, а таксама пралікі ў падрыхтаванасці Чырвонай Арміі да абароны прывялі да трагічных наступстваў першых месяцаў вайны. Што ж тычыцца ўмелага кіраўніцтва ваеннымі дзеяннямі, то прыпісванне гэтай якасці Сталіну проста несур'ёзнае. Ён не быў прафесійным вайскоўцам, а сутыкненне гіганцкіх армій на фронце ў 1000 кіламетраў — не гульня ў бірулькі. Для такой работы ёсць выключныя спецыялісты. Такім чынам, узнікае натуральнае пытанне: хто быў вядучай фігурай у планаванні разгрому нямецка-фашысцкіх полчышчаў у савецкім ваенным кіраўніцтве? Гэта была асоба ці ўсё ж мы маем права казаць пра калектыўны ўдзел і военачальнікаў, і палітычнага кіраўніцтва краіны ў распрацоўцы і паспяховым кіраўніцтве аперацыямі Чырвонай Арміі?

На пастаўленае пытанне ёсць адказ. Акрамя цэлай плеяды бліскучых савецкіх палкаводцаў, якія атрымлівалі перамогі на полі бою, — таго ж Жукава, Васілеўскага, Ракасоўскага, Канева і іншых — быў чалавек, які, на агульную думку, унёс вырашальны ўклад у распрацоўку найважнейшых аперацый Чырвонай Арміі. Гэтага славутага стратэга звалі Аляксей Інакенцьевіч Антонаў. Ён адзіны генерал, які атрымаў ордэн Перамогі, і фармулёўка ў ягоным узнагародным лісце выглядае зусім інакш, чым у іншых кавалераў найвышэйшай узнагароды. Яна канкрэтная — «За паспяховае планаванне баявых аперацый і каардынацыю дзеянняў франтоў».

## ПЕРШЫЯ ВЫПРАБАВАННІ

...У Гродне ёсць старажытная вулачка, якая многія гады — і пры Расіі, і пры Польшчы — насіла назву Іерусалімскай. Хутчэй за ўсё, гэтае незвычайнае імя было звязана з тым, што вяла яна да двух могілак — праваслаўных і каталіцкіх. Савецкая ўладзе, якая прыйшла ў Заходнюю Беларусь, гэтая назва разаа слых, і яе перайменавалі ў вуліцу Танкістаў (у кожным заходнебеларускім горадзе ці нават мястэчку абавязкова ёсць такая назва).

Жыхары Гродна часта бывалі ў гэтым раёне горада, таму што тут размяшчаўся галоўны рынак. Але наўрад ці хто-небудзь ведаў пра тое, што ў невялікім драўляным дамку на Іерусалімскай нарадзіўся чалавек, жыццё якога, без перабольшання, сур'ёзна паўплывала на лёсы свету ў XX стагоддзі. Менавіта тут 120 гадоў таму, 15 верасня 1896 года, нарадзіўся Аляксей Інакенцьевіч Антонаў, будучы начальнік Генеральнага штаба Чырвонай Арміі — военачальнік, розумам якога былі спланаваны ўсе самыя паспяховыя аперацыі Чырвонай Арміі, пачынаючы ад бітвы на Курскай дузе і заканчваючы бітвай за авалоданне Берлінам і разгром Квантунскай арміі.

Сям'я Антонавых была інтэрнацыянальная, бацька Інакенцій Аляксеевіч — артылерыйскі афіцэр, з дваран, праўда, небагатых. Маці Тэрэза Ксавер'еўна — каталічка з польскіх шляхцічаў, сасланых у свой час у Сібір. Там і пазнаёмілася бацькі будучага генерала. Мяркуючы па фотапартрэтах, якія вісяць у тым ліку і ў музеі гродзенскай 11-й школы імя генерала Антонава, гэта была прыгожая пара. І сын іх таксама не падвёў — яго розум, чалавечыя якасці, спакойны характар і яркую знешнасць адзначалі ўсе, хто ведаў яго.

Зачараваны цудоўным гродзенскім ландшафтам, Аля, як звалі яго ў сям'і, быў абсалютна перакананы, што звяжа сваю будучыню з вывучэннем прыроды. Як бы там атрымалася далей, сёння ніхто не скажа, але Аляксею яшчэ не споўнілася і васьмі, калі сям'я пераехала ў горад Астрог Валынскай губерні. Там у 1907-м ён паступае ў гімназію. Але ў наступным годзе нечакана памірае бацька (пражыў усяго 49 гадоў). Цяжкі ўдар — не толькі маральны, але і матэрыяльны: цяпер дзеці жывуць за кошт пенсіі, а маці, акрамя таго, падзарабляе рэпетытарствам.

У 1914-м Тэрэза Ксавер'еўна з дваімі дзецьмі — Аляксеем і яго старэйшай сястрой Людмілай — перабіраюцца ў Петраград, дзе жывуць іх сваякі. Але злы рок даганяе іх сям'ю — праз год памірае і маці. Асірацелы сын не апускае рук, заканчвае гімназію і паступае на фізмат Петраградскага ўніверсітэта. Вучыцца няма на што, праз два месяцы ён пакідае ўніверсітэт і ідзе працаваць на завод. У разгары Першая сусветная вайна, юнака прызываюць у войска і накіроўваюць у Паўлаўскае ваеннае вучылішча. Пасля кароткатэрміновага навучання, ужо ў канцы 1916-га, ён аказваецца на фронце ў лейб-гвардыі егерскага палка. Спачатку прапаршчык, потым палкавы ад'ютант. У ліпені 1917-га на Паўднёва-Заходнім фронце ён атрымлівае асколачнае раненне ў галаву і першую ўзнагароду — ордэн Святой Ганны IV ступені «За адвагу».

Антонаў дэмабілізуецца. Успамінае сястра, Людміла Інакенцьеўна: «Аляксей вырашыў ажыццявіць колішнюю мару — стаць ляснічым — і паступіў у Петраградскі лясны інстытут... Заняткі ў інстытуце ішлі паспяхова, хоць даводзілася адначасова працаваць і ў харчовым камітэце Петраграда. Аднак вучыцца давялося нядоўга — здарылася адна рэвалюцыя, потым другая, і праз паўтара года яго прызвалі зноў, на гэты раз у Чырвоную Армію». Так з 11 красавіка 1919 года ён стаў кадравым вайскоўцам.

Падчас грамадзянскай вайны, ужо на пасадзе начальніка штаба 45-й брыгады 15-й дывізіі, Антонаў прайшоў літаральна агонь і ваду, у прывятнасці, у ліку першых фарсіраваў Сіваш.

Наступіў мірны час. Аляксей Інакенцьевіч працягвае службу на штабных пасадах. З атэстацыі 1925 года, падпісанай камандуючым войскамі Украінскай ваеннай акругі Іонам Эмануілавічам Якірам:



**Генерал арміі, выдатны савецкі военачальнік і адзін з самых таленавітых штабных афіцэраў Савецкіх Узброеных сіл. Удзельнічаў у распрацоўцы ўсіх значных аперацый Вялікай Айчыннай вайны з 1942 года, браў удзел у рабоце Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый.**

**Адзіны генерал, узнагароджаны ордэнам «Перамога» (астатнія кавалеры гэтага найвышэйшага ордэна мелі званне, не ніжэйшае за маршала).**

*«Валодае мяккім характарам, шырокай ініцыятывай, кемлівы, умела разбіраецца ў любым становішчы... Каштоўны, незаменны штабны работнік. Важныя якасці: акуратнасць і настойлівасць».*

У 1928 годзе Антонаў паступае на камандны факультэт Ваеннай акадэміі імя Фрунзэ. Ён заканчвае яго ў 1931-м, авалодаўшы не толькі спецыяльнымі ведамі, але і замежнымі мовамі. Пасля года працы ў войсках яго зноў накіроўваюць у акадэмію, на толькі што створаны там новы факультэт — аператыўны. Пасля яго заканчэння ў 1933-м Антонаў атрымлівае дыплом з адзнакай і такую характарыстыку: «Выдатны аператыўна-штабны работнік, гатовы для работы ў вышэйшых штабах».

Неўзабаве ён ужо начальнік аператыўнага аддзела штаба Харкаўскай ваеннай акругі. А ў 1936-м ствараецца Акадэмія Генеральнага штаба, і Антонава запрашаюць у першы набор яе слухачоў. Праз год наркам Варашылаў забірае яго адтуль і прызначае начальнікам штаба Маскоўскай ваеннай акругі. У канцы 1938-га адбываецца новы паварот у ягоным лёсе: Антонаў становіцца выкладчыкам Акадэміі імя Фрунзэ. І да таго ж вядзе навуковую працу, у прыватнасці аналізуе тактыку нямецкіх войскаў у наступленні і эвалюцыю прымянення танкавых злучэнняў на прыкладзе грамадзянскай вайны ў Іспаніі. У сакавіку 1941 г. генерал-маёр Антонаў атрымаў прызначэнне намеснікам начальніка штаба Кіеўскай асобай ваеннай акругі (КАВА). Менавіта яму, знаўцу баявых дзеянняў вермахта, трэба было рыхтаваць войскі на заходняй мяжы СССР для адбівання нямецкай агрэсіі, якая няспынна набліжалася.

Аднак у поўнай меры выканаць гэтую задачу не ўдалося. Да моманту прыбыцця Антонава ў Кіеў укамплектаванасць войск КАВА складала 65-70%. Таму невыпадкова, што ў першыя дні вайны часці акругі панеслі цяжкія страты. 24 чэрвеня 1941 года генерал Антонаў атрымлівае прызначэнне на пасаду начальніка штаба Кіеўскай асобай ваеннай акругі, паспяхова працягваючы распачатую ім некалькі раней мабілізацыйную работу. Ён жа займаўся пытаннямі эвакуацыі насельніцтва, цывільных і ваенных прадпрыемстваў і матэрыяльных каштоўнасцяў з прыфрантавой паласы, фарміраваннем новых ваенных часцей і падраздзяленняў. У жніўні 1941-га Антонаў вядзе работу па фарміраванні кіравання Паўднёвым фронтам і пасля ўзначальвае яго штаб.

Крытычнае становішча восені 1941 г. таксама дазволіла Антонаву праявіць свае навыкі. У канцы жніўня — пачатку верасня нямецкая група армій «Поўдзень» выйшла да Дняпра на шырокім фронце ад Херсона да Кіева, частка злучэнняў праціўніка ўжо фарсіравала Днепр, і да канца верасня савецкія войскі былі адкінуты на 100 кіламетраў да Мелітопаля. 5 кастрычніка Антонаў выязджае на месца баёў у штаб 9-й арміі для распрацоўкі мерапрыемстваў па вывадзе войскаў з-пад пагрозы ў раёне Растова-на-Доне. Ведучы цяжкія баі супраць больш падрыхтаванага саперніка, савецкае ваеннае кіраўніцтва, тым не менш, не ігнаравала ваенна-аналітычнай работы. Генералу Антонаву было даручана абагульніць вопыт, назапашаны за першыя месяцы вайны.

Менш чым за месяц ён сабраў і апрацаваў усе даныя, вынікам чаго сталі рэкамендацыі па вядзенні бою, разведцы, маскіроўцы і ўзаемадзеянні сіл. Праведзеная Антонавым работа адыграла ключавую ролю ў Растоўскай абарончай аперацыі 1941 года. Своечасова зробленая перагрупоўка, дбайнае ўмацаванне абарончых пазіцый і больш эфектыўнае ўпраўленне дзеяннямі войскаў дазволілі прадухіліць фарсіраванне немцамі ракі з ходу. Больш за тое, 1-я танкавая армія фон Клейста была адкінута контрударам 9-й арміі на 10-15 кіламетраў.

У пачатку снежня 1942 года начальнік Генеральнага штаба А.М. Васілеўскі прапанаваў Антонаву пасаду свайго намесніка — начальніка Аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба, асабліва падкрэсліваючы ўхваленне яго кандыдатуры асабіста І.В. Сталіным. 11 снежня Антонаў прыбыў у Маскву.

## У СТАЎЦЫ

Да таго, пакуль прызначылі А. Антонава на гэтую пасаду, начальнікі Аператыўнага ўпраўлення Генштаба змяняліся 7 разоў на працягу паўгода. У абавязкі начальніка ўпраўлення, апроч іншага, уваходзілі штодзённыя даклады Стаўцы аб становішчы спраў на франтах. Першы час на пасадзе начальніка Аператыўнага ўпраўлення Антонаў да працы са Стаўкай практычна не прыцягваўся. Ды і праца ў Генеральным штабе была для яго не зусім камфортнай. Ён некалькі разоў хадайнічаў аб пераводзе назад на фронт, бліжэй да месца падзей, аднак увесь час атрымліваў адмову. Больш за тое, Васілеўскі ў адным з дакладаў характарызаваў Аляксея Інакенцьевіча як выключна каштоўнага чалавека для Генштаба і Стаўкі.

Асноўным напрамкам работы Антонава было стратэгічнае планаванне. Пачынаючы з Курскай аперацыі, Антонаў удзельнічаў у распрацоўцы ўсіх ключавых аперацый і кампаній Узброеных Сіл СССР, па некалькі разоў на дзень бываючы з старанна падрыхтаванымі дакладамі ў Вярхоўнага Галоўнакамандуючага І.В. Сталіна. Асабліва цесна ў гэты перыяд генерал Антонаў працаваў з Васілеўскім і Жукавым. Агульнай задумай аперацыі на Курскай дузе было супрацьпастаўленне чаканаму нямецкаму наступу ў глыбока эшаланіраваную абарону, пастаянна аслабляючы нямецкія войскі ў баях, а затым — пераход у контрнаступленне і знішчэнне сіл праціўніка. У цэлым гэтая задума ў ходзе абарончага этапу бітвы была паспяхова праведзена ў жыццё.

Значны ўклад А.І. Антонаў унёс у трэцюю зімовую ваенную кампанію, планаванне якой пачалося ў лістападзе 1943 г. У задумы Стаўкі ВГК уваходзіла разгортванне поўнамаштабнай наступальнай аперацыі на шырокім фронце ад Балтыкі да Чорнага мора сіламі войскаў усіх родаў і франтоў. У сваіх успамінах — нарысе аб Антонаве — генерал Шцяменка пісаў:

*«У Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Аляксей Інакенцьевіч карыстаўся вялікім аўтарытэтам за веданне справы, за мужнасць, якія выказваліся ў прамаце і праўдзівасці дакладаў, у якіх нішто не перабольшвалася. Усё заўсёды адпавядала праўдзе, якой бы цяжкай яна ні была. Мабыць, аўтарытэтам Антонаў карыстаўся і за тое, што адважваўся, калі было трэба, пярэчыць Сталіну і, ва ўсякім выпадку, выказваць сваю думку».*

Немалую ролю адыгралі і асабістыя якасці першага намесніка начальніка Генштаба, на што Шцяменка звяртае асаблівую ўвагу: «Без перабольшвання можна сказаць, што Аляксей Інакенцьевіч быў чалавекам выключным. Яго адметнымі рысамі з'яўляліся перш за ўсё высокая эрудыцыя, агульная і асаблівая ваенная культура, якія выяўляліся ў шырыні і глыбіні падыходу да ўсіх пытанняў работы, у мове, паводзінах, стаўленні да людзей. За шэсць гадоў сумеснай працы ў Генеральным штабе мне ні разу не даводзілася бачыць яго разлаваным, каб ён сварыўся на кагосьці, прыніжаў. Ён валодаў дзіўна роўным, ураўнаважаным характарам, які нічога, аднак, агульнага не меў з мяккацеласцю. Ураўнаважанасць і сардэчнасць у Антонава спалучаліся з рэдкай цвёрдасцю і настойлівасцю...».

Цяпер правадыр ужо не прымае ніводнага рашэння, не абмеркаваўшы яго папярэдне з Аляксеем Інакенцьевічам. Ён выклікае яго часам па некалькі разоў на дзень. У 1943—1945 гадах толькі ў крамлёўскім кабінеце Сталіна Антонаў бываў не менш за 238 разоў — больш, чым хто-небудзь з кіраўнікоў наркамата абароны і Узброеных сіл, і больш, чым усе камандуючыя ўсімі франтамі за ўвесь час вайны, разам узятыя.

Пра гэта ж сведчыць (у сваіх мемуарах) вядомы авіяканструктар Аляксандр Сяргеевіч Якаўлеў, які таксама часта бываў у Крамлі: «Антонаў быў вельмі блізкі да Сталіна, той лічыўся з яго думкай, меў да яго відавочную сімпатыю і давер, праводзіў ўдваіх з ім доўгія гадзіны, абмяркоўваючы становішча на франтах і плануючы будучыя аперацыі. Антонаў трымаўся проста, без пыхі і гонару. Ён быў заўсёды сціпла адзеты — гімнасцёрка, брыджы, боты, і толькі генеральскія пагоны выдавалі яго высокае становішча ў войску».

Наступіў 1944 год, і самай яркай старонкай ваеннай дзейнасці выдатнага стратэга стала Беларуская наступальная аперацыя, вядомая пад назвай «Баграціён». Вясной паступілі прапановы камандуючых франтамі аб магчымых дзеяннях на іх напрамках. Ацаніўшы і ўзважыўшы гэтыя меркаванні, улічыўшы дыслакацыю і стан гітлераўскіх армій, Антонаў з удзелам вядучых спецыялістаў Генштаба распрацаваў прынцыпова новую аператыўную задуму. Галоўным у летняй кампаніі 1944 года станавіўся разгром беларускай і львоўскай груповак праціўніка. Звязаныя з гэтым аперацыі намячаліся на вялізнай прасторы, а распрацоўка нагадвала закручаны дэтэктыў.

Цалкам з задуманым планам былі знаёмы ўсяго пяць чалавек: першы намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, начальнік Генштаба і яго намеснік, начальнік Аператыўнага кіравання і адзін з яго намеснікаў. Перапіска на гэтую тэму была забаронена, тэлефонныя размовы і тэлеграмы — таксама. Аператыўныя планы для франтоў распрацоўвалі сакрэтна 2-3 штабісты, пісаліся яны ад рукі і дакладваліся камандуючым пры асабістым кантакце ў Стаўцы.

Была арганізавана шырокамаштабная кампанія па дэзынфармацыі праціўніка.

# АЛЯКСЕЙ АНТОНАЎ

З гэтай мэтай у войсках разгарнулі работу па ўдасканаленні абароны. Каб збіць з панталыку нямецкую разведку, прынялі, як піша Шчыменка, і такія меры: «Франтавыя, вайсковыя і дывізіённыя газеты публікавалі матэрыялы толькі па абарончай тэматыцы. Уся вусная агітацыя была нацэлена на ўтрыманне занятых пазіцый». На месцы шырока прымяняліся макеты баявой тэхнікі і іншыя фальшывыя аб'екты. Ля макетаў паставілі зеніткі, арганізаваўшы ў той жа час патруляванне знішчальнікаў — для «сурапрацьпаветранай абароны». Бачнасць і праўдападобнасць ілжэаб'ектаў прадпісвалася праверыць фатаграфаваннем з паветра.

І немцы паверылі. У сваіх пасляваенных успамінах камандуючы Чацвёртай арміяй вермахта Курт фон Ціпельскірх адзначыў, што гітлераўская вярхушка чакала нападу на поўдні і ў Прыбалтыцы, але ніяк не ў цэнтры.

14 мая распрацоўка плана ў Генштабе была завершана. Канчатковы варыянт змяшчаў кароткі тэкст і карту. 20 мая, пасля некалькіх дзён роздумаў, як піша Шчыменка, яго змацаваў сваім подпісам Антонаў. Яшчэ праз некалькі дзён план старанна абмеркавалі ў Стаўцы ў прысутнасці Жукава, Васілеўскага, камандуючых франтамі і некаторых іншых военачальнікаў.

Аперацыя «Баграціён» пачалася 22 чэрвеня, нечакана для праціўніка — як снег на галаву пасярод лета — і праходзіла пад пільным вокам Аляксея Антонава. Яна працягвалася 68 дзён і завяршылася поўным разгромам магутнай нямецкай групы армій «Цэнтр», а таксама буйнымі перамогамі на львоўскім і выбаргскім напрамках. Гісторыкамі ўсяго свету яна прызнана найбуйнейшай паспяховай ваеннай аперацыяй за ўсю гісторыю чалавецтва. На фронце ў 1100 кіламетраў было ажыццёўлена прасоўванне ў глыбіню на 600 кіламетраў. Цалкам вызвалена Беларусь, а таксама частка Прыбалтыкі і ўсходняя частка Польшчы. Адначасова гэта стала найбуйнейшым паражэннем нямецкай арміі ў Другой сусветнай вайне.

## АНТОНАЎ? НЯХАЙ ЗАСТАЕЦЦА Ў ЦЕНІ...

Узнагароджанні не прымусілі сябе чакаць. Ужо 29 чэрвеня Ракасоўскі атрымаў маршальскую зорку, а 30 чэрвеня — званне Героя Савецкага Саюза. Званне Героя было прысвоена Васілеўскаму, Баграмяну і іншым военачальнікам, а таксама паўтары тысячы ўдзельнікаў бітваў. Жукаў стаў двойчы Героем. Сталін атрымаў захопленыя віншавальныя тэлеграмы ад Чэрчыля і Рузвельта.

Узнікае натуральнае пытанне: а як быў адзначаны аўтар і распрацоўшчык гэтай унікальнай задумы? Пра яго таксама не забыліся: далі... ордэн Суворава першай ступені!

Не ведаем, што рабілася на душы ў Аляксея Інакенцьевіча, можам толькі меркаваць. Але Антонаў праўдапаю быў яшчэ патрэбен. Ён распрацоўвае ўсе далейшыя наступныя буйныя аперацыі, уключаючы Берлінскую. Да канца вайны ён «робіць надвор'е» ў Стаўцы, і пасля пытанні Вярхоўны вырашае з ім.

У пачатку лютага 1945 года маршал Васілеўскі прызначаецца камандуючым 3-м Беларускім фронтам, а генерал арміі Антонаў — начальнікам Генеральнага штаба Чырвонай Арміі.

Аляксей Інакенцьевіч уваходзіць у склад савецкай дэлегацыі на Ялцінскай канферэнцыі кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. Ужо з восені 1944 года, сабраўшы групу ваенных экспертаў, ён займаўся падрыхтоўкай гэтай сустрэчы. А адкрылася яна 4 лютага 1945 года. У першы дзень Антонаў выступіў з дакладам аб становішчы на савецка-германскім фронце. Дамовіліся аб каардынацыі дзеянняў войскаў саюзнікаў — даручалася гэта Генштабу сумесна з кіраўнікамі саюзных місій у Маскве. Узгаднілі ўступленне СССР у вайну з Японіяй.

У сувязі з гэтым там жа, у Ялце, Антонаў са сваімі памочнікамі давялося тэрмінова распрацаваць, калі і якія савецкія войскі перакінуць з захаду на ўсход і вызначаць, якімі сіламі, у якія тэрміны можна будзе нанесці ўдар па Квантунскай групоўцы. Паводле папярэдніх разлікаў, дата наступлення была вызначана як два-тры месяцы пасля капітуляцыі Германіі. Цікавым фактам у гэтым планаванні з'яўляецца тое, што, калі справа дайшла да рэальных дзеянняў праз паўгода, у жніўні, амаль нічога ў гэтых планах не трэба было мяняць.

Удзельнічаў Антонаў і ў рабоце першай пасляваеннай канферэнцыі краін — удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі ў Патсдаме.

4 чэрвеня 1945 года генерал Антонаў быў узнагароджаны найвышэйшым ваенным ордэнам СССР «Перамога» — «за ўмелае выкананне заданняў Вярхоўнага Галоўнакамандавання ў справе правядзення баявых аперацый вялікага маштабу». Узнагароджанне ўнікальнае па сваёй сутнасці, бо ўсе 14 савецкіх кавалераў ордэна, акрамя Антонава, мелі званне, не ніжэйшае за маршала. У гэтай сітуацыі прагледжваецца некалькі нюансаў. Па-першае, узнагарода Антонаву была дадзена не падчас вайны, калі ён актыўна распрацоўваў паспяховыя аперацыі Чырвонай Арміі, а ўжо пасля перамогі. А па-другое, у той жа дзень з такой жа фармулёўкай ордэнам «Перамога» быў узнагароджаны і маршал Цімашэнка. Чалавек, які, бўышы камандуючым розныімі франтамі, заваліў некалькі аперацый, быў зняты з камандных пастоў і даслужваў прадстаўніком Стаўкі. Прычым ва ўзнагародным лісце Цімашэнка ішоў першым — з парушэннем нават алфавітнага парадку. Тым самым у вачах многіх людзей, далёкіх ад Крамля, антонаўскі ордэн губляў свой бляск.

Праўдаыр ніколі нічога выпадкова не рабіў.

## У НЯМІЛАСЦІ

Наступны ход — беспрыкладны і па задуме, і па выкананні: 26 чэрвеня 1945 года ўстанаўліваецца званне Генералісімуса Савецкага Саюза, а на наступны дзень яно прысвойваецца «выдатнаму стратэгу» Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну за перамогу над Германіяй. Антонаў сыходзіць у яшчэ больш глыбокі цень.

Сталін выдатна разумеў, што быць геніяльным кіраўніком, які выратаваў краіну падчас вайны, — гэта самае высокае прызнанне ў народзе і бясспрэчны аўтарытэт. Цяпер усё, што ён рабіў у мінулым, робіць у сучаснасці і будзе рабіць у будучыні, стане прызнавацца не толькі правільным, але і вялікім.

Між тым задуманая праваўдырам аперацыя «Антонаў» працягваецца. У сакавіку 1946-га ён вяртае Васілеўскага на пасаду начальніка Генштаба, а Аляксея Інакенцьевіча пераводзіць у яго першыя намеснікі. Але ёсць яшчэ адна думка ў праваўдыра. Калясальныя па аб'ёме ўзброеныя сілы, укамплектаваныя для баявых дзеянняў, у мірны час не патрэбны ў такой колькасці. Належала іх масава расфарміраваць. І Антонаву даручаюць праваўдзенне дэмабілізацыі.

Што ж, Сталіну нельга адмовіць у правільнай ацэнцы сваіх кадраў — ён дакладна выбраў чалавека для такой складанай справы, якая патрабуе велізарных арганізатарскіх намаганняў. У той жа час цяпер уся Чырвоная Армія забудзецца, нарэшце, пра Антонава як пра паспяховага аналітыка і распрацоўшчыка бліскучых перамог і будзе памятаць толькі як генерала, які праводзіў дэмабілізацыю, звальняючы з арміі тысячы і тысячы афіцэраў.

У 1948-м заданне выканана, па дамах адпраўлена восем мільёнаў франтавікоў. Больш Антонаў у Маскве не патрэбен. Сталін выводзіць яго з Генштаба і адпраўляе служыць намеснікам камандуючага Закаўказскай ваеннай акругай. Гэта ўжо адкрытая ссылка. У 1950-м ён становіцца там камандуючым, што, зрэшты, не нашмат больш ганарова.

Толькі праз год пасля смерці Сталіна Антонава вяртаюць у Генштаб першым намеснікам начальніка. Не таму, што вырашылі аддаць належнае яго мінулым заслугам, а таму, што з'явілася новая цяжкая, шматпланавая праца. У процівагу НАТА Савецкі Саюз збірае ў Варшаве кіраўніцтва краін сацыялістычнага лагера, і яны заключаюць дагавор аб калектыўнай бяспецы. Трэба было стварыць новыя фарміраванні, арганізоўваць сумесныя ваенныя вучэнні, каардынаваць дзеянні органаў кіравання. І ў 1955 годзе Антонава прызначаюць начальнікам штаба Аб'яднаных узброеных сіл дзяржаў — удзельніц Варшаўскага дагавора.



**Вышэйшыя афіцэры СССР і ЗША на сустрэчы начальнікаў Генеральных штабоў у час Патсдамскай канферэнцыі. Начальнік Генеральнага штаба РСЧА генерал арміі Аляксей Антонаў сядзіць у белай форме злева.**



Вольга ЛЕПЯШЫНСКАЯ.

У тым жа годзе яго спасцігае вялікае асабістае гора — памірае жонка, Марыя Дзмітрыеўна Цялюк. Яны пажаніліся яшчэ ў дваццатых і ідэальна падыходзілі адно аднаму. Яна была такой жа спакойнай, добразычлівай, ураўнаважанай, як і ён. Аляксей Інакенцьевіч цяжка перажываў страту каханай жанчыны. На яе магіле на Новадзявочых могілках ён паставіў прыгожы помнік і кожную нядзелю прыязджаў туды з вялікім букетам кветак.

## АНТОНАЎ І ЛЕПЯШЫНСКАЯ

А потым адбылася падзея, пра якую яе ўдзельніца, выпадкова сустрэўшыся з Антонавым, распавядае так:

*«У 1956 годзе быў нейкі прыём у гасцініцы «Савецкая». Ён быў у цывільным. Я была ў звычайнай сукенцы. Ні я не ведала, хто ён такі, ні ён, хто — я. Мы выйшлі адначасова з дзвярэй гасцініцы. Вялікі тэатр з нейкай прычыны не прыслаў па мяне машыну, ці яна спазнілася, не памятаю. Ішоў лівень. Я кідалася ў пошуку тэлефона. Мужчына, убачыўшы, што я без машыны, прапанаваў мяне падвезці. Дарога была даволі доўгай. Мы размаўлялі. Прайшоў нейкі час, і я адчула, што маё сэрца нешта вельмі дзіўна забілася. Я зразумела, што гэта каханне».*

Гэтыя словы належаць славутай савецкай балерыне Вользе Лепяшынскай. Народная артыстка СССР. Чатыры Сталінскія прэміі. З дзесятак ордэнаў і медалёў. Узнагароды сямі замежных дзяржаў. Гэта ўсё Лепяшынская — «страказа», як называў яе праваўдыр.

Яна была на 20 гадоў маладзейшай за Антонава. У іх знайшліся агульныя тэмы для ўзаемаадносін, якія паступова перараслі ў больш сур'ёзнае пачуццё. Да сустрэчы з генералам Вольга Лепяшынская пражыла насычанае, яркае і па-свойму драматычнае жыццё. Яе бліскучы талент выявіўся рана, і, стаўшы салісткай Вялікага тэатра, яна заваявала бясспрэчнае прызнанне аматараў балета. Яна прайшла ўсю вайну ў франтавых артыстычных брыгадах. Валодаючы кіпучай энергіяй і выбухным тэмпераментам, актыўна ўдзельнічала ў самых розных грамадскіх арганізацыях высокага ўзроўню.

Асобная размова — мужчыны на яе жыццёвым шляху. У 1935-м у яе пачаўся раман з рэжысёрам «Ленфільма» Ільёй Траўбергам. У 1940-м яны рассталіся. У пачатку вайны яна сустрэла Леаніда Фёдаравіча Райхмана і стала яго жонкай. Райхман быў генерал-лейтэнантам дзяржбяспекі. Прыйшоў час, яго арыштавалі і пасадзілі, а выпусцілі толькі пасля смерці Сталіна і Берыі. Але ў турме пасля катаванняў яму дапамагла выжыць жанчына-ўрач, і ён застаўся з ёй.

А ў 1956-м яна сустрэла Аляксея Антонава. Пра тое, хто з'явіўся ініцыятарам гэтага знаёмства, і далейшае развіццё адносін, можна меркаваць па ўспамінах Кацярыны Сяргееўны Катуковай, жонкі маршала бранятанкавых войскаў М.Я. Катукова: «Тады ў Маскве вельмі шмат гаварылі пра гэтую дружбу. Вольга Васільеўна — разумная жанчына, яна здолела заваяваць сэрца Аляксея Інакенцьевіча Антонава. Для яго пачалося зусім іншае жыццё, зусім новае. Марыя Дзмітрыеўна была памяркоўнай, ціхай, жыццё іх ішло мерна і спакойна. Цяпер жа ўсё пайшло па-іншаму. Аляксей Інакенцьевіч кінуўся з галавой у працу. Ён кіпеў энергіяй, зусім не адпачываў, але быў ён ужо нездаровы. Свой шлюб з Вольгай Лепяшынскай па законе так і не афарміў».

І тут трэба зрабіць адно, але вельмі істотнае адступленне: быў яшчэ адзін мужчына ў жыцці Вольгі Лепяшынскай. Іван Гронскі, журналіст і рэдактар, некалі блізкі сябар Сталіна, у сваіх успамінах піша пра тое, што ў сярэдзіне трыццатых праваўдыр нярэдка вяртаўся ад балерыны глыбокай ноччу...

Саюз з сур'ёзным ваенным чалавекам не змяніў прывычнага ладу жыцця балерыны. Пасля кожнага спектакля, у якім яна танцавала, артысты дружна накіроўваліся адначасова гэтую падзею да яе дадому — на кватэру Антонава. Багема — яна і ёсць багема. Праца ў гэтыя гады ў Аляксея Інакенцьевіча была нервовай і напружанай. Раней вечарамі ён мог расслабіцца і адпачыць. Цяпер жа ўсё было інакш...

Фінал кароткага, усяго шасцігадовага сумеснага жыцця балерыны і генерала аказаўся прадказальным. Аляксею Інакенцьевічу стала дрэнна проста на працы, і 18 чэрвеня 1962 года ён пайшоў з жыцця. Для Вольгі Васільеўны гэта была трагедыя — спроба звіць сямейнае гняздо завяршылася няўдачай трэці — і апошні — раз.

Антонаў пайшоў з жыцця на пасадзе буйнога дзеяча міжнароднага значэння. Урну з яго прахам пранеслі па Краснай плошчы кіраўнікі краіны і партыі. Пахавалі яго ў крамлёўскай сцяне. Стаяў гарачы чэрвеньскі дзень. У Лепяшынскай ужо даўно балелі вочы. Ад неміласэрна пякучага сонца, ад стрэсу яна страціла зрок. Далей яе чакала адзінота. Памерла яна зусім нядаўна — у 2008 годзе.

А імя Антонава пасля яго смерці нібы адышло ў нябыт. Мікіта Хрушчоў, які ўзначаліў краіну ў 1953-м, не забыўся верных яму падчас вайны людзей і шчодра раздаў ім званні маршалаў і Герояў Савецкага Саюза. Антонаў у гэтую абойму не трапляў ні па якіх паказчыках. Леаніда Брэжнева, які прыйшоў на змену Хрушчову, найбольш хвалявала ўласная персона. З публікацый, якія з'явіліся ў друку ў гады ягонага кіраўніцтва, па ўсім выходзіла, што вайну выйгралі, у першую чаргу, дзякуючы яму, Брэжневу. І прысвоілі дарагому Леаніду Ільічу званне маршала, а ў 1978 годзе далі ордэн «Перамога», і ўжо ішла гаворка аб прысваенні звання генералісімуса. Не паспелі. Праўда, ордэна «Перамога» пасля яго смерці ўсё ж такі пазбавілі.

У 2003 годзе адзначалася 60-годдзе Курскай бітвы, і ў сувязі з гэтым група военачальнікаў звярнулася да кіраўніцтва Расіі з хадайніцтвам аб прысваенні звання Героя Расіі генералу арміі Аляксею Антонаву. Хадайніцтва засталося без увагі.

Можа быць, яно і правільна: які сэнс цяпер, заднім днём, даваць мёртваму тое, што ён заслужыў пры жыцці? Па-першае, гэты званні — і Героя, і маршала — паспелі абясцэніцца. А па-другое, справа не ў званнях, а ў прызнанні. Хай Антонаў застаецца генералам без залатой зоркі Героя — у канчатковым выніку, гэта сведчанне асабліваасці той эпохі. Але няхай яго імя будзе ў адным шэрагу з імёнамі іншых выдатных палкаводцаў, якія здабывалі Перамогу не толькі і не столькі коштам мільёнаў жыццяў, колькі сваім розумам і талентам.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
slaneuski@zviazda.by

# ДЫЯМЕНТ НА ЎСКРАЙКУ ТАКЛА-МАКАНА

## Чым невялічкі Дуньхуан прываблівае мільёны турыстаў з усяго свету?

**Паднябесная насамрэч вялікая краіна. Ва ўсіх сэнсах, у тым ліку па тэрыторыі. Пагадзіцеся, зусім не шмат знойдзецца на свеце дзяржаў, дзе можна падарожнічаць па разнастайных прыродных ландшафтах і кліматычных зонах. У Кітаі я не першы раз, але заўжды прывожу адтуль новыя неперадавальныя ўражанні. Летась пашчасціла пабачыць дзве легендарныя ракі — Янцзы і Хуанхэ, а сёлета напрыканцы ліпеня (у самую спякоту — даходзіла да +45 па Цэльсію!) апынуўся ў... пустыні, дзе знаходзіцца «сталіца» кітайскіх будыстаў — шыкоўны Дуньхуан.**


Храмавы комплекс высечаны ў скале.

### «БРАМА» Ў ПАДНЯБЕСНУЮ

Горад Дуньхуан — гарадскі аазіс на ўскрайку пустыні Такла-Макан (а практычна пасярод дзвюх найвялікшых пустынь, паколькі непадалёк пачынаецца Гобі), побач з маляўнічымі краявідамі Тыбецкага нагор'я. Па кітайскіх мерках гэта невялічкі гарадок — каля 180 тысяч жыхароў. Штогод горад наведвае некалькі мільёнаў турыстаў.

У II стагоддзі да н.э. на загад імператара У-Дзі кітайцы ўстанавілі ваенны пост Шачжоу (старажытная назва Дуньхуана). Да гэтага часу на Вялікай Кітайскай сцяне былі дабудаваныя ўмацаванні-заставы Юймэньгуань («нефрытавыя вароты») і Янгуань, якія абазначалі мяжу Паднябеснай. Дарэчы, адсюль і пайшла назва Дуньхуан (у перакладзе з кітайскай «бліскучы»), паколькі агні вартавой вышкі ўночы былі здалёк відаць шматлікім караванам. Такім чынам, гэтае месца насамрэч становіцца «брамай» у Паднябесную. Менавіта тут заканчваецца і Вялікая Кітайская сцяна. Зрэшты, у старажытнасці кітайцы лічылі, што тут яна пачынаецца, уяўляючы сабой дракона, які выгінаўся праз усю Паднябесную і быў павернуты грознай галавой на Захад.

Калісьці Дуньхуан быў адным з ключавых транзітных пунктаў на Вялікім шаўковым шляху, на канцах якога сталі Кітай і Рым, а станцыямі на шляху былі Персія, Індыя, Аравія, Сірыя.

У гэтым месцы вялікая караванная дарога падзялялася на паўночную ветку, якая праходзіла праз землі ўйгураў і кіргізаў, а таксама паўднёвую, што ішла праз Тыбет і Афганістан. Такім чынам, гандлёвы маршрут агінаў пустыню Такла-Макан і цягнуўся ажно да Міжземнамор'я. Тысячагоддзямі праз Дуньхуан праходзілі сотні караванаў, нагружаных самымі рознымі таварамі — ад збожжавых культур да каштоўных камянёў. У апошнім перад пустыняй вялікім аазісе караваншчыкі правяралі груз і запасаліся вадой. Менавіта сюды прыйшоў, адолеўшы пустыні і горы, Марка Пола, змучаны доўгім шляхам, разрэджаным паветрам Памірскіх вышынь, смагай і пылам.

### ПЕРШАДРУКАР ВАН ЧЫ

Стратэгічны аазіс насамрэч стаў калыскай будызму ў Кітаі. Адсюль манахі ішлі па Шаўковым шляху, распаўсюджваючы свае веды сярод мясцовага насельніцтва. У горадзе збіраліся кітайскія і замежныя паслядоўнікі будызму, а таксама шматлікія паломнікі з розных краін. Непадалёк ад Дуньхуана знаходзіцца адзін з самых вялікіх будыйскіх храмавых комплексаў Цяньфодун («пячоры тысячы будаў»), які ўяўляе сабой выразаныя ў скалах пячоры. Гэты комплекс часцяком называюць Магаа — па імені галоўнай пячоры.

Храмавы комплекс мае сваю дзіўную гісторыю. У 366 годзе манах Лэ Цзун, праязджаючы па Вялікім шаўковым шляху, убачыў водбліск святла, з якога выйшла тысяча будаў. Уражаны гэтым знакам, ён пакінуў караван і адправіўся да аазіса. Манах высек у скале першую пячору, за ім пацягнуліся тысячы паломнікаў. Калісьці тут цякла пустынная рака, якая ўтварыла скальную сцяну. З IV па XIV стагоддзе вернікі выкалупалі ў ёй з параўнальна мяккага каменю прыкладна тысячу ніш і пячор. Яны ператварыліся ў адзін з самых прыгожых будыйскіх храмавых комплексаў у свеце.

Да нашых дзён захавалася 700 пячор, якія цягнуцца на 1680 метраў. Сярод іх ёсць вялікія, якія дасягаюць 200 «квадратаў», і зусім маленькія, не большыя за чалавечы рост. Адметнай асаблівасцю пячор Магаа з'яўляецца тое, што амаль усе яны распісаны каляровымі фрэскамі будысцкай тэматыкі.


У пячорах Магаа.

Адным з самых значных адкрыццяў, якія прынеслі Дуньхуану сусветную вядомасць, стаў старажытны будыйскі архіў. У 1900 годзе ў адной з пячор адшукалі каля 50 тысяч помнікаў пісьмовай і мастацкай культуры IV-XI стагоддзяў. Сярод іх найстаражытнейшыя зараастрыйскія і будыйскія тэксты, шаўковыя гравюры і малюнкі Буды.

Найбольш цікавая са знаходак «пячоры рукапісаў» — «Алмазная сутра». Гэта скрутак з шасці злепленых лістоў тэксту і ліста з выявай Буды. Ён з'яўляецца першай у свеце друкаванай кнігай. Майстар Ван Чы выразаў на шасці драўляных дошках люстраныя выявы іерогліфаў і, змазаўшы дошкі фарбай, накладаў на іх лісты паперы. Гэта здарылася ў 868 годзе.

Пячоры Дуньхуана не толькі помнік ранняга будызму, але, што самае галоўнае, яны гісторыя кітайскай культуры, найлепшая і самая поўная манаграфія такога роду, якая захавалася ў Кітаі. Ды і не толькі ў Паднябеснай — у свеце няма іншага месца, дзе можна было б прасачыць развіццё мастацтва і літаратуры цягам паўтара тысячагоддзя. Нездарма ЮНЕСКА ўнесла Магаа ў ахоўны спіс Сусветнай культурнай спадчыны.

### ПЕСНЯ ПЯСКОЎ

На паўднёвым украйку аазіса, за 5-6 км ад Дуньхуана, можна пабачыць пясчаныя дзюны вышынёй больш за 200 метраў — самыя вялікія ў Кітаі. За памеры іх называюць гарамі, а назва Мінша даслоўна перакладаецца з кітайскай як «пяскі, што спяваюць». І сапраўды, калі дзьме вецер, тутэйшыя пяскі выдаюць вельмі мудрагелістыя гукі і ствараецца ўражанне, што яны насамрэч спяваюць. Навукоўцы тлумачаць: гэта адбываецца праз трэнне пясчынак. А мясцічы расказваюць, што калісьці тут адбылася вялікая бітва. Нечакана наляцела бура і засыпала пяском абодва варожыя войскі. З таго часу тут чуваць галасы пахаваных жыўцом людзей.

Сам па сабе аазіс у пустыні ўжо лічыцца цудам прыроды, а тут, акрамя гэтага, яшчэ і дзіўнай прыгажосці возера Юэяцюань, што практычна немагчыма ў пустыні. Сваёй формай вадаём нагадвае серп або паўмесяц, ад якога ён і атрымаў сваю назву. Складана паверыць, што гэтаму аазісу больш за 2 тысячы гадоў і створаны ён самой прыродай, а не намаганнямі чалавека. Дарэчы, для навукоўцаў дасюль застаецца загадкай, як возера не перасохла і не было пахавана пад пластом пяску.

Каля вадаёма знаходзіцца будыйскі храм. Усё разам — возера, будынкі, «музычныя» пяскі — утварае непаўторны пейзаж, дзеля якога варта тут пабываць. Раю абавязкова пакарыць Міншу і з вышыні агледзець наваколле. Усім выдаюць спецыяльныя бахілы, бо ногі па калена літаральна засмоктвае пясок. Дзюны выкарыстоўваюцца для спуску на асаблівай дошцы (сэндбордынг — пустынны аналаг сноўбордынгу). Зусім не дзіўна, што ў гэтыя мясціны імкнуцца трапіць мільёны турыстаў з усяго свету.

...Калі адляталі (Дуньхуан мае сучасны аэрапорт, які, дарэчы, ужо не першае дзесяцігоддзе абслугоўвае пераважна чартары з Японіі), пачыналася пясчаная бура. Так дыямент пустыні развітваўся з намі — быццам заспяваў сваю спрадвечную журботную песню.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
*Дуньхуан, Кітай.*

Варта пакарыць супердзюну.



## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 27 сентября 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС | Размер задатка |
| 1. | Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008 | 4101080 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 2 642,90 бел. руб. (26 429 000 бел. руб. образца 2000 года) | 264 бел. руб. (2 640 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| 2. | Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008 | 4101081 | | 2 642,90 бел. руб. (26 429 000 бел. руб. образца 2000 года) | 264 бел. руб. (2 640 000 бел. руб. образца 2000 года) |

**Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.**

**Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **27 сентября 2016 года в 14.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 12.09.2016 по 23.09.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017)217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).**



УНП 100289278

## ИНФОРМАЦИЯ
## ДЛЯ ЖЕЛАЮЩИХ ОБМЕНЯТЬ ИМЕННЫЕ ПРИВАТИЗАЦИОННЫЕ ЧЕКИ «ИМУЩЕСТВО» НА АКЦИИ ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 35»

Приложение №1
к решению Мингорисполкома
25-08-2016 №2470

Перечень открытых акционерных обществ, акции которых предлагаются для обмена

| № п/п | Наименование | Размер пакета акций, шт. | Сроки обмена |
|---|---|---|---|
| 1 | ОАО «Стройтрест №35» | 103735 | 12.09.2016-30.06.2019 |

Приложение №2
к решению Мингорисполкома
25-08-2016 №2470

Лимиты приема именных приватизационных чеков «Имущество» в разрезе обособленных подразделений ОАО «АСБ Беларусбанк» по г. Минску ОАО «Стройтрест № 35»

| Код | Номер | Наименование | Почтовый адрес | Лимит ИПЧ «Имущество» |
|---|---|---|---|---|
| 603 | 510 | Филиал АСБ | ул. Куйбышева, 18 | 23500 |
| 815 | 511 | Филиал АСБ | ул. Долгобродская, 1 | 23000 |
| 614 | 514 | Филиал АСБ | ул. Сурганова, 47а | 11520 |
| 121 | 524 | Центр банковских услуг | ул. Физкультурная, 31 | 11413 |
| 254 | 527 | «Белжелдор» | ул. Воронянского, 7а | 11412 |
| 610 | 529 | «Белсвязь» | пр. Независимости, 56 | 11440 |
| 601 | 500 | Филиал АСБ | пр. Дзержинского, 69, к. 1 | 11450 |
| | | | ИТОГО | 103735 |



**Государственное авиационное аварийно-спасательное учреждение «АВИАЦИЯ» МЧС Республики Беларусь**

**ПРОВОДИТ ПРОЦЕДУРУ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ЗАКУПКЕ УСЛУГ НА МОДЕРНИЗАЦИЮ МИНИ-КОТЕЛЬНОЙ В ЗДАНИИ КДП.**

Информация о проведении процедуры размещена на сайте **www.icetrade.by,**
процедура №2016-372827, тел. 385-13-86, факс 287-59-55.

УНП 190438733



Утерянный бланк страховой компании «Промтрансинвест» Зеленая карта BY/07/13411062 **считать недействительным в связи с утерей.**

■ Пажывём — пабачым

# НАВУКОЎЦЫ ПРАДКАЗВАЮЦЬ ЗНІКНЕННЕ КАВЫ

**Змяненне клімату згубна адбіваецца на існаванні кававых плантацый. Калі тэндэнцыя глабальнага пацяплення працягнецца, да канца XXI стагоддзя кавы на Зямлі не застанецца.**



Даследаванне правялі спецыялісты з Кліматычнага інстытута Аўстраліі. У публікацыі па яго выніках гаворыцца, што ўжо да 2050 года колькасць сельскагаспадарчых участкаў, на якіх вырошчваеццаававае дрэва, паменшыцца ў два разы. А да 2080-га гэтыя расліны, як мяркуюць спецыялісты, цалкам знікнуць з твару Зямлі.

Прычынай з'яўляецца глабальнае пацяпленне: з ростам тэмпературы плантацыі ўсё больш актыўна пашкоджваюцца грыбковымі захворваннямі. Камфортна пры ўмове высокіх тэмператур сябе адчуваюць і шкоднікі, якія атакуюць кававыя дрэвы. Толькі ў 2012 годзе ў Цэнтральнай Амерыцы ад гэтага пацярпела палова участкаў, а некаторыя вытворцы ў Гватэмале страцілі 85% ураджаю. Па паведамленнях The Guardian, агульная шкода для рэгіёна ў 2012—2013 гадах склала 500 млн долараў; 350 тысяч чалавек засталося без працы.

Калі сучасныя тэмпы глабальнага пацяплення захаваюцца, тэрыторыі, на якіх будуць расці здаровыя кававыя расліны, зменшацца. Скароціцца не толькі агульны аб'ём кававых зерняў, але таксама іх сартавая разнастайнасць. Гэта, у сваю чаргу, негатыўна паўплывае на жыццё 25 мільёнаў чалавек з Бурундзі, Эфіопіі, Нікарагуа, Гватэмалы, Бразіліі, В'етнама, Калумбіі, Інданезіі і дзясяткаў іншых дзяржаў, дзе вырошчваецца кава. Свае смакавыя звычкі прыйдзецца мяняць мільёнам аматараў гэтага напою: штодзень у свеце выпіваецца 2,25 млрд кубкаў кавы, пры гэтым аб'ём спажывання расце на 5% штогод.

Спецыялісты прапануюць некалькі захадаў, здольных хоць бы збольшага змяніць сітуацыю. Па-першае, фермерам час шукаць новыя месцы пад плантацыі: яны павінны быць размешчаны на вялікіх вышынях або далёка ад экватара. Кававыя дрэвы даюць плады толькі праз некалькі гадоў пасля пасадкі, таму рабіць гэта неабходна ўжо цяпер. Таксама навукоўцы нагадваюць пра меры па барацьбе з глабальным пацяпленнем, якія павінны прымаць усе краіны свету ■

■ Чалавек

# У КАГО ДАЎЖЭЙШЫЯ РУКІ

**Чалавек з часу свайго ўзнікнення прайшоў доўгі эвалюцыйны шлях і моцна змяніўся. Як і ў выпадку іншых жывых істот, на яго дзейнічаў натуральны адбор, г.зн. выжывалі і/або пакідалі больш нашчадкаў у папуляцыі толькі тыя, хто валодаў прыкметамі, найбольш выгаднымі ў канкрэтных абставінах. Але што гэта былі за абставіны? І якія менавіта прыкметы аказаліся эвалюцыйна больш выгаднымі? Чалавек (як і любая іншая жывая істота) пабудаваны даволі складана, так што, відавочна, розныя асаблівасці фарміраваліся пад ціскам розных умоў.**

Даследчыкі з Універсітэта Тэнесі паспрабавалі высветліць, якія эвалюцыйна-экалагічныя фактары ўплывалі на даўжыню чалавечых рук і ног. Да гэтага часу лічылася, што чалавек у дачыненні да канечнасцяў падпарадкоўваецца двум вядомым экалагічным законам: правілу Алена і правілу Бергмана.

Паводле правіла Алена, у цеплакроўных жывёл з такім самым ладам жыцця часткі цела, якія выступаюць (гэта значыць ногі, вушы, хвасты і г. д.), будуць меншымі ў халодным клімаце і большымі ў цёплым. Асабліва добра гэта праяўляецца, напрыклад, у ліс: у паўночнага пясца самыя маленькія вушы і кароткая морда, а ў пустыннага фенека ўсё наадварот — вялікія вушы і доўгая морда.



Тутсі — адны з самых даўганогіх і даўгарукіх людзей на Зямлі.



У паўночных эскімосаў, у адпаведнасці з правілам Алена, рукі і ногі карацейшыя, чым ва ўсіх іншых народаў.

Правіла Бергмана гаворыць у цэлым аб велічыні цела: згодна з ім, тыя з цеплакроўных, што жывуць у халодным клімаце, будуць буйнейшымі за тых, што жывуць у цяпле. Напрыклад, самыя вялікія мядзведзі — арктычныя белыя, а самыя дробныя — акулярныя з Паўднёвай Амерыкі. Правіла Бергмана таксама выконваецца для многіх блізкіх відаў і для папуляцый аднаго віду (іншымі словамі, не варта параўноўваць сланоў з лемінгамі).

З фізіялагічнага пункту гледжання абодва правілы кажуць пра адно і тое ж — пра эканомію цяпла. Агульная цеплапрадукцыя ў цеплакроўных залежыць ад аб'ёму цела, а хуткасць цеплааддачы — ад плошчы яго паверхні. Пры павелічэнні памераў арганізмаў аб'ём цела расце хутчэй, чым яго паверхня, так што ў халодных шыротах выгадна быць вялікім. Выступаючыя часткі цела, у сваю чаргу, моцна павялічваюць паверхню і слаба павялічваюць аб'ём, так што дзеля эканоміі цяпла вушы, ногі і іншае павінны быць меншымі.

Даволі доўга лічылася, што правілы Алена і Бергмана выконваюцца і для людзей, і таму ў экватарыяльных і трапічных народаў рукі і ногі будуць даўжэйшыя, а ў паўночных — карацейшыя. Крыстэн Савейл і яе калегі яшчэ раз пераправерылі гэта на людзях з Паўночнай Афрыкі, з так званай Чорнай Афрыкі, якая ляжыць на поўдзень ад Сахары, з Еўропы і з Арктыкі — усяго 14 папуляцый і 400 індывідаў. Канечнасці параўноўвалі не цалкам, а па касцях: плечавыя і прамянёвыя косці ў руках, сцегнавыя і вялікія галёначныя косці ў нагах. Наконт прамянёвай і вялікай галёначнай касцей усё пацвердзілася: яны сапраўды карацелі пры руху на поўнач. Сцегнавая костка таксама змянялася ў памеры, аднак, як гаворыцца ў артыкуле ў PNAS, змены ў ёй не былі звязаны з навакольным кліматам. Што ж да плячача, то яно, насуперак правілу Алена, у паўночных папуляцый станавілася даўжэйшым, а не карацейшым — на думку аўтараў працы, тут сваю ролю адыграў генетычны ўзаемаўплыў: скарачэнне прамянёвай і вялікай галёначнай касцей праз нейкі ўнутраны малекулярны механізм справакавалі падаўжэнне плечавой косці.

Тут варта заўважыць, што правіла Бергмана (і правіла Алена, якое прымыкае да яго) зусім не ўніверсальнае — з яго ёсць выключэнні, і цяпер гавораць, што яно носіць статыстычны характар і выразна праяўляецца толькі пры іншых роўных умовах. На памер жывёл уплываюць і іншыя фактары, акрамя тэмпературы, а прыстасоўвацца да сурова клімату можна рознымі спосабамі, напрыклад перанастройваючы сваю біяхімію.

У выпадку з рознымі чалавечымі папуляцыямі відаць, як адна прыкмета (даўжыня канечнасцяў) распадаецца на некалькі (даўжыня розных касцей), так што правіла можа дзейнічаць і не дзейнічаць у межах аднаго і таго ж віду, і што, разглядаючы такія комплексныя прыкметы, варта заўсёды памятаць пра ўплыў генаў адзін на аднаго.

Усё гэта, відавочна, датычыць не толькі рук і ног, але і іншых характэрных асаблівасцяў арганізма, чыю эвалюцыйную гісторыю мы спрабуем аднавіць ■

■ Прадметная гісторыя

**Працягваем знаёміцца з цікавымі і незвычайнымі рэчамі з нашага мінулага.**

**Лавец слёз, або слёзніца.** Невялікі посуд з вузкім рыльцам зроблены такім чынам, каб можна было прыціскаць яго проста да кутка вока. Яго прызначэнне — збор слёз, а гісторыя налічвае больш за тры тысячагоддзі. Пасудзіны для слёз былі папулярныя, напрыклад, у Персіі: мужчыны, якія вярталіся пасля бою дадому, перш за ўсё правяралі слёзніцы сваіх жонак, каб вызначыць, ці моцна яны сумавалі ■



■ Дайджэст

## Пацяпленне адкрые Паўночны полюс для караблёў

**Нават калі чалавецтва скароціць выкіды вуглякіслага газу да мінімуму, за наступныя сто гадоў значная частка арктычных льдоў растане, адкрыўшы новыя марскія шляхі.**



Навукоўцы з універсітэта Рыдзінга ў Вялікабрытаніі даследавалі дынаміку раставання арктычных льдоў і прыйшлі да высновы, што рэгіён і марскія шляхі па паўночных марах і Ледавітым акіяне ў хуткім часе стануць нашмат больш даступнымі. Ужо да 2050 года колькасць шляхоў, па якіх можна будзе падарожнічаць па Арктыцы без ледакола, падвоіцца. Навукоўцы прадказваюць, што судны, прызначаныя для хаджэння па водах, якія не замярзаюць, нават змогуць праходзіць праз Паўночны полюс у летнія месяцы. Такія прагнозы вучоных для варыянту з максімальным уразаннем выкідаў $CO_2$. Калі Парыжскае пагадненне не прымусіць краіны абмежаваць выкіды вуглякіслага газу і глабальную тэмпературу не ўдасца ўтрымаць ад росту больш чым на два градусы, ад арктычных льдоў застанецца яшчэ менш. У такім выпадку судны з мінімальным супрацьлёдавымі прыстасаваннямі змогуць курсіраваць па Арктыцы амаль круглы год ужо да канца стагоддзя.

## Аналіз крыві дапаможа загадзя выявіць рак

**Навукоўцы распрацавалі рэвалюцыйны тэст, які дапаможа спрагназаваць развіццё анкалогіі за дзесяць гадоў да з'яўлення сімптомаў.**



Біёлагі з брытанскага ўніверсітэта Суонсі называюць гэты аналіз «пажарным дэтэктарам»: падобна таму, як яго датчык рэагуе на часцінкі дыму, новы тэст распазнае змены ў крыві. Паводле слоў прафесара Гарэта Джэнкінса, лідара даследчай групы, мутацыі ў чырвоных крывяных цельцах пачынаюцца задоўга да таго, як пацыенту ставяць фатальны дыягназ. Просты аналіз крыві з пальца на працягу дзвюх гадзін вызначыць прысутнасць клетак з пашкоджаным «будаўнічым» бялком. У здаровага чалавека такіх клетак усяго некалькі на мільён, а ў будучых анкахворых — дзясяткі. Магчымасць вызначыць рак на такой ранняй стадыі дазволіць пазбегнуць хіміятэрапіі і апрамяньвання і абысціся простай аперацыяй і прыёмам лекаў. Важна, што сабекошт гэтага аналізу невысокі — усяго 35 фунтаў стэрлінгаў. Зараз біёлагі рыхтуюцца праводзіць выпрабаванні свайго тэсту: калі ён апраўдае сябе, то праз дзесяць гадоў (або менш) будзе даступны на сусветным узроўні.

## У Даніі знайшлі меч бронзавага веку

**На паўночным захадзе дацкага вострава Зеландыя быў знойдзены старажытны бронзавы меч. Нягледзячы на 3000-гадовы ўзрост, яго 67-сантыметровае лязо ўсё яшчэ вострае.**



Пара дацкіх археолагаў-аматараў Эрнст Крысціянсен і Ліс Тхеркілдсен выкарыстоўваюць любую магчымасць для таго, каб знайсці які-небудзь старажытны артэфакт. Адправіўшыся нядаўна на вячэрнюю прагулку, яны захапілі з сабой металашукальнік. Пачуўшы сігнал, што выдаваў прадмет, які знаходзіцца на глыбіні каля 30 см, сужэнцы вырашылі не даставаць яго самастойна. Археолагі звязаліся з прадстаўнікамі музея Vestsjælland і на наступны дзень вярнуліся на месца знаходкі разам з імі.

Засцярогі былі апраўданыя: пад зямлёй сапраўды знаходзіўся рэдкі прадмет — бронзавы меч агульнай даўжынёй 82 см, з даўжынёй клінка 67 см. Спецыялісты аднеслі зброю да IV перыяду скандынаўскага бронзавага веку (прыблізна 1100—900 гг. да н.э.). Меч выдатна захаваўся: ён не толькі не страціў вострыню, выразным застаўся і арнамент на яго рукаятцы.

Унікальная знаходка папоўніць лік экспанатаў музея. Варта адзначыць, што ў Даніі дагэтуль пастаянна знаходзяць сведчанні старажытных часоў. Нядаўна іншыя археолагі-аматары знайшлі тут найбуйнейшы ў гісторыі скарб вікінгаў ■

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.
hvir@zviazda.by

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»
## 12 октября 2016 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность в Логойском и Узденском районах

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, определенном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации для проведения аукциона, бел. руб. | Начальная цена земельного участка, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Логойский район, Околовский с/с, д. Жестиное, ул. Центральная, 13А | 623285404101000129 | 0,2389 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 905,53 | 1 450,00/14 500 000 | 290,00/2 900 000 |
| 2 | Логойский район, Околовский с/с, д. Жестиное, ул. Центральная, 22 | 623285404101000130 | 0,2372 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 446,81 | 1 440,00/14 400 000 | 280,00/2 800 000 |
| 3 | Логойский район, Околовский с/с, д. Коргово, 19Б | 623285406101000035 | 0,2473 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 351,67 | 1 095,53/10 955 266 | 210,00/2 100 000 |
| 4 | Логойский район, Околовский с/с, д. Новоселки, 11А | 623285408601000013 | 0,2500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 838,72 | 1 470,00/14 700 000 | 290,00/2 900 000 |
| 5 | Узденский район, Озерский с/с, д. Королево, ул. Березовая, 6 | 625682506101000209 | 0,1531 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | - | 9 000,00/90 000 000 | 1 800,00/18 000 000 |
| 6 | Узденский район, Озерский с/с, аг. Озеро, ул. Вишневая, 2 | 625682508601000590 | 0,1652 | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 605,45/6 054 500 | 23 000,00/230 000 000 | 4 600,00/46 000 000 |
| 7 | Узденский район, Озерский с/с, аг. Озеро, ул. Вишневая, 11 | 625682508601000609 | 0,1339 | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 605,45/6 054 500 | 23 000,00/230 000 000 | 4 600,00/46 000 000 |
| 8 | Узденский район, Озерский с/с, аг. Озеро, ул. Рождественская, 1в | 625682508601000880 | 0,1299 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 045,35/10 453 466 | 23 000,00/230 000 000 | 4 600,00/46 000 000 |

**Аукцион состоится 12 октября 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.**

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, **по 6 октября 2016 г. включительно** в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00.

Контактные телефоны: + 375 (17) 205-46-61, +375 (44) 789-10-18.

**Задатки для участия в аукционе перечисляются не позднее 6 октября 2016 года на следующие расчетные счета:**

**на лоты 1–4** перечисляется **на расчетный счет № 3600619121105 Околовского сельисполкома**, ЦБУ № 611 филиала № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк», Минская область, г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, код 601, УНП 600181669, код платежа – 04901;

**на лоты 5–8** перечисляется **на расчетный счет № 3641062500143 Озерского сельисполкома**, ЦБУ № 625 филиала № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк», Минская область, г. Узда, б-р Дзержинского, 7, код 601, УНП 600110154, код платежа – 04901.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (задатки) не позднее 6 октября 2016 г.** в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона);

**представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на внесение платы за земельный участок в размере начальной цены земельного участка, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

**дополнительно представляется:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка **обязан:**

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить местному исполнительному комитету расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте (массиве застройки). Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»
## 14 октября 2016 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность в Минском районе

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, определенном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации для проведения аукциона, бел. руб. | Начальная цена земельного участка, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Боровлянский с/с, д. Лесковка, участок № 505 | 623680605601001227 | 0,1478 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 651,16/16 511 600 | 60 000,00/600 000 000 | 12 000,00/120 000 000 |
| 2 | Боровлянский с/с, д. Лесковка, участок № 552 | 623680605601001230 | 0,1496 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 640,63/16 406 300 | 60 000,00/600 000 000 | 12 000,00/120 000 000 |
| 3 | Боровлянский с/с, д. Чертяж, участок № 253 | 623680608601000423 | 0,1333 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 601,86/16 018 600 | 45 000,00/450 000 000 | 9 000,00/90 000 000 |
| 4 | Горанский с/с, д. Аксаковщина | 623681300101000250 | 0,1319 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 2 092,50/20 925 000 | 16 221,00/162 210 000 | 3 240,00/32 400 000 |
| 5 | Горанский с/с, д. Крылово, участок № 5 | 623681310101000118 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 2 127,33/21 273 300 | 23 313,00/233 130 000 | 4 660,00/46 600 000 |
| 6 | Горанский с/с, аг. Новоселье, участок № 67 | 623681315601000575 | 0,1447 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 503,76/15 037 600 | 12 354,00/123 540 000 | 2 470,00/24 700 000 |
| 7 | Горанский с/с, аг. Новоселье, участок № 142 | 623681315601000582 | 0,1501 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 480,41/14 804 100 | 12 806,00/128 060 000 | 2 560,00/25 600 000 |
| 8 | Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 7124, участок № 36 | 623683403101007824 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 954,18/19 541 800 | 59 800,00/598 000 000 | 11 960,00/119 600 000 |
| 9 | Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 7139, участок № 11 | 623683403101007823 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 874,25/18 742 500 | 28 980,00/289 800 000 | 5 790,00/57 900 000 |
| 10 | Крупицкий с/с, д. Вербники | 623683901101000089 | 0,1000 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 905,52/19 055 200 | 17 000,00/170 000 000 | 3 400,00/34 000 000 |
| 11 | Крупицкий с/с, д. Столбуновичи | 623683909101000142 | 0,1030 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | газ, водопровод | 1 901,36/19 013 600 | 17 000,00/170 000 000 | 3 400,00/34 000 000 |
| 12 | Луговослободской с/с, д. Обчак | 623684109101000347 | 0,1000 | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 659,92/6 599 200 | 16 731,00/167 310 000 | 3 340,00/33 400 000 |
| 13 | Острошицко-Городокский с/с, д. Буденнного, ул. Луговая, участок № 9 | 623685201601000194 | 0,1008 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 2 126,53/21 265 300 | 15 000,00/150 000 000 | 3 000,00/30 000 000 |
| 14 | Острошицко-Городокский с/с, д. Галица, участок № 56 | 623685202101000105 | 0,1494 | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 63,00/630 000 | 22 000,00/220 000 000 | 4 400,00/44 000 000 |
